

МУЗЫ З ВІНТОЎКАМІ 5

ЯК ПАВЫСІЦЬ ДАХОДНАСЦЬ МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ МС





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 САКАВІКА 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 45 (28912)



9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай МЕЛЬЧАНКА, намеснік міністра ўнутраных спраў:**

*«Дэлегацыі нашага МУС вывучалі арганізацыю аховы правапарадку пры правядзенні I Еўрапейскіх гульняў 2015 года, IV Ісламскіх гульняў салідарнасці 2017 года ў Азербайджане. Вывучаўся вопыт праваахоўных органаў замежжа падчас буйных міжнародных спартыўных мерапрыемстваў у Расіі, Кітаі, Казахстане і Японіі. Вынікі паказваюць, што ў цэлым беларуская канцэпцыя гарантавання бяспекі падчас такіх мерапрыемстваў адпавядае ўсім стандартам. Амаль 300 супрацоўнікаў тэрытарыяльных органаў міліцыі і ваеннаслужачых унутраных войскаў МУС прайшлі навучанне англійскай мове ва ўстановах адукацыі МУС. Больш за 60 супрацоўнікаў і ваеннаслужачых вучацца і цяпер».*

## КОРАТКА

- **Павел Латушка прызначаны дырэктарам Купалаўскага тэатра.**
- Мінск увайшоў у дзясятку папулярных у расіян гарадоў на сакавіцкія святы.
- **21-гадовая мадэль Кайлі Джэнер стала самым маладым мільярдэрам у гісторыі. Яна зарабіла свае мільярды на вытворчасці фірменнай касметыкі Kylie Cosmetics.**



- Фінал дзіцячага «Еўрабачання-2019» пройдзе ў польскім Глівіцэ.
- **Даўжнікі з Беларусі не змогуць выехаць за мяжу праз тэрыторыю Расіі.**
- У Мінску летась нарадзіліся 235 двайнятаў і пяць трайнятаў.


ISSN 1990 - 763X


# ЦЯПЛО ЛЮБЯЧЫХ СЭРЦАЎ

*Дарагія суайчынніцы!*

*Ад усёй душы віншую вас з Днём жанчын.*

*Гэтае свята напоўнена асаблівай вясновай атмасферай і самымі светлымі пачуццямі да прадстаўніц прыгожай паловы чалавецтва, якія дораць нам утульнасць роднага дому, клопат і дабрыню.*

*Непараўнальная прыгажосць беларускіх жанчын, іх прафесійныя поспехі і перамогі ўслаўляюць нашу Радзіму далёка за яе межамі. Вашы разуменне і падтрымка, цяпло любячых сэрцаў натхняюць нас, мужчын, на новыя здзяйсненні.*

*Мы дзякуем вам за актыўны ўдзел ва ўсіх сферах жыцця грамадства, выхаванне юнага пакалення, уменне падтрымліваць спакой і дабрабыт у сям'і. Менавіта жанчыны робяць свет дабрэйшым, забяспечваючы яго духоўнае адзінства і стабільнасць.*

*Жадаю вам моцнага здароўя, добрага настрою і здзяйснення ўсіх жаданняў.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



**На невялікай сталічнай вуліцы Прыгожай знаходзіцца кветкавая крама, а ў ёй прадаюцца надзвычай прыгожыя і самыя свежыя ружы, прычым беларускія. Тут не толькі напярэдадні свят, асабліва на Восьмага Сакавіка, але і ў іншыя дні палічкі патанаюць у сапраўднай ружовай квецені, а пакупнікам прапануецца ажно дваццаць сартоў каралевы кветак. Напярэдадні жаночага свята і мне давялося наведаць гэты кветкавы рай ды пабачыць, як працуюць і дораць свой пазітыўны настрой ветлівыя прадаўцыфлярысты гандлёвай сеткі «ДорОрс» Святлана РУДЗЬ і Алена ГУКАЙЛА.**

**Нягледзячы на чаргу, гаспадыні кветкавай крамы не стамляюцца быць усмешлівымі і ўважлівымі да пакупнікоў. Нават у сваё свята, якое яны, як заўсёды, правядуць на рабоце.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Паміж намі, дзяўчынкамі

# НА ФЕРМУ — З УКЛАДКАЙ І МАКІЯЖАМ



**Выязны салон прыгажосці адправіўся да жывёлаводаў Добрушскага раёна напярэдадні Міжнароднага дня жанчын. Паміж ранішняй і абедзеннай дойкамі сельскія работніцы аказаліся ва ўладзе цырульнікаў, візажыстаў і майстроў па манікюры. За знешнімі і ўнутранымі пераменамі даярак і цялятніц назірала «Звязда».**

## СЁННЯ СВЯТА Ў ДЗЯЎЧАТ

— Каровы французскай парфумы не спужаюцца? — пытаюцца стылісты.

— Звыкнуцца! Мы ж да іх водараў прызвычаіліся, — усміхаюцца ў адказ работніцы гаспадаркі «Чырвоная Буда».

Раніца ў Насовіцкім Доме культуры пачалася незвычайна. Невялічкі старэнькі будынак пераўтварыўся ў жаночае царства, дзе простыя жывёлаводы змаглі па-сапраўднаму расслабіцца і на некалькі гадзін забыцца пра надоі і прывагі. Стрыжка ці ўкладка, макіяж з ліфтынг-таніраваннем або вячэрнім смокі-айс, французскі, галівудскі ці класічны манікюр ад майстроў б'юці-індустрыі Гомеля — выбірай, што душа пажадае. Усё бясплатна.


СТАР. 4

Блізкая ўлада

# Чым дыхае «глыбінка»

## Мясцовая вертыкаль павінна быць бліжэй да чалавека

**Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Максім РЫЖАНКОЎ пазнаёміўся з вытворчасцю фабрыкі грыбоў «Логал-Бія», пабываў на прадпрыемстве па перапрацоўцы сыроваткі «Праймілк», сустрэўся з працоўным калектывам горадаўтваральнага завода «Аўтапровад».**

Апошнім часам Шчучын актыўна развіваецца. Кожны год у раёне рэалізуецца ад аднаго да трох інвестыцыйных праектаў. Летась тут пачала дзейнічаць фабрыка па вырошчванні шампіньёнаў. Яе магутнасць — 2,5 тысячы тон грыбоў у год. На прадпрыемстве створана звыш 100 рабочых месцаў. З пускам другой чаргі, які адбудзецца сёлета, колькасць работнікаў падвоіцца. **Дырэктар фабрыкі Аляксандр АЛЕЙНІКАЎ** паведаміў, што гэта другі рэалізаваны праект кампаніі ў райцэнтры. Некалькі гадоў таму ўстаноўлена сонечная станцыя. Раён зацікаўлены ў рабоце з прыватнымі інвестарамі.

— Мая задача — даведацца на месцы, чым дыхае «глыбінка», як развіваецца рэгіён, пачуць каментарыі ад суб'ектаў гаспадарання і простых работнікаў. Ацаніць работу мясцовых уладаў можна, у першую чаргу, па прыцягненні інвестыцый, — адзначыў Максім Рыжанкоў.

У шэрагу такіх праектаў самым унікальным можна назваць вытворчасць сыроватачна-тлушчавага канцэнтрату на заводзе «Праймілк». Гэта імпартазамяшчальны прадукт, які забяспечвае ўласны рынак і добра прадаецца за мяжой. Тавар карыстаецца попытам у 24 краінах свету, нядаўна наладжаны экспарт у Японію. У суткі завод перапрацоўвае 360 тон канцэнтраванай сыроваткі, якую малочныя камбінаты раней папросту вылівалі. Зараз з яе атрымліваецца патрэбны інгрэдыент для харчовай прамысловасці.

— Профільных прадпрыемстваў такога ўзроўню няма ва ўсёй краіне, — падкрэсліў Максім Рыжанкоў. — Тут і высокая прадукцыйнасць, і высокія заробкі. Як мне паведамілі, яны складаюць у сярэднім 1300 рублёў. Добра, што горад прырастае такімі сучаснымі, канкурэнтнымі прадпрыемствамі. Гэта сведчыць аб спрыяльным асяроддзі для інвестараў.

На заводзе «Аўтапровад» першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта сустрэўся з працоўным калектывам. Прадпрыемства ў ліку горадаўтваральных, тут працуе каля 700 чалавек, але ёсць дэфіцыт кадраў. І гэта праблема не толькі згаданага завода, але і раёна ў цэлым. Па словах **старшыні Шчучынскага райвыканкама Сяргея ЛОЖАЧНІКА**, патрэба ў працоўных рэсурсах складае да 600 чалавек. На кожнага беспрацоўнага існуе 10 вакансій. Прыцягваюцца работнікі з суседніх раёнаў. Вырашэнне праблемы мясцовыя ўлады бачаць у будаўніцтве жылля, профільным навучанні, прафарыентацыі школьнікаў.

Прыцягненне інвестыцый наўпрост залежыць ад работы з кадрамі, лічыць Максім Рыжанкоў. Гэта важная ўмова для ўстойлівага развіцця рэгіёна. Каб чалавека замацаваць на роднай зямлі, трэба, каб узровень яго дабрабыту паляпшаўся.

— Гэты аспект можна назваць самым важным у палітыцы краіны. І рэгіёны адчуваюць дзяржаўную падтрымку. Але многае залежыць і ад іх саміх — як яны працуюць з інвестарамі, ствараюць для іх умовы, забяспечваюць сацыяльныя гарантыі сваім жыхарам, — падкрэсліў Максім Рыжанкоў.

Быццам бы многія раёны падобны адзін да аднаго, кіраўнікі атрымалі адукацыю ў адной краіне і былі падабраны на свае пасады. Але атрымліваюцца даволі розныя вынікі. У чым тут справа? На думку першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, многае залежыць ад рашэнняў мясцовай вертыкалі. Яны не павінны адыходзіць ад рэальнасці і патрабаванняў часу, мусяць быць бліжэй да чалавека.

— Чым больш цеплыні да людзей, чым больш улады жывуць іх патрэбамі, у рэжыме анлайн адчуваюць змены, бачаць, дзе каму і калі патрэбна дапамога, тым лепш рэгіён будзе развівацца. І цэнтр яму хутчэй акажа падтрымку, бо відавочна, што зерне дапамогі ўпадзе ў добрую глебу.

Падчас сустрэчы з калектывам былі агучаны новыя планы мясцовых уладаў. Было заяўлена аб падпісанні ў хуткім часе шэрагу інвестпраектаў. Не застануцца без увагі і сацыяльныя праекты. У Шчучыне развіваецца добрая спартыўная інфраструктура, але няма фізкультурна-аздараўленчага комплексу з басейнам. Гэта пытанне будзе ўзята пад кантроль абласных уладаў, запэўніў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ЛІСКОВІЧ**. Такія аб'екты становяцца часткай сучасных стандартаў.

Ішла гаворка і аб прыцягненні турыстаў у рэгіён. Адзін з работнікаў завода «Аўтапровад» прыгадаў, што ў будынку прадпрыемства падчас Першай сусветнай вайны ўтрымліваліся палонныя французскія афіцэры, сярод якіх быў і будучы прэзідэнт Францыі Шарль дэ Голь. Гэта можа стаць тэмай для экспазіцыі. Дарэчы, у горадзе нямала гістарычных аб'ектаў, якія могуць стаць цікавымі для турыстаў. У першую чаргу, палац Друцкіх-Любецкіх XIX стагоддзя. Некалькі гадоў таму будынак аднавілі, і ён стаў візітнай карткай Шчучына.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# «ЗНІЖЭННЕ ЎЗРОЎНЮ ЗАРОБКАЎ НЕ ДАПУСКАЕЦЦА»

## Мінпрацы пракаментавала новую пастанову Саўміна

**Нагадаем, што 18 студзеня 2019 года Прэзідэнтам быў падпісаны Указ № 27 «Аб аплаце працы работнікаў бюджэтных арганізацый», якім вызначаны асноўныя падыходы па комплекснай змене сістэмы. У рамках рэалізацыі гэтага Указа была прынята пастанова Савета Міністраў ад 28 лютага 2019 года № 138 «Аб аплаце працы работнікаў бюджэтных арганізацый».**



У Мінпрацы і сацабароны адзначаюць, што змяненне сістэмы аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый будзе праводзіцца ў межах выдзеленых на гэтыя мэты сродкаў з захаваннем наяўнага ўзроўню заработнай платы кожнага канкрэтнага работніка. У прыватнасці, у адпаведнасці з пунктам 12 Указа, не дапускаецца зніжэнне памераў налічанай заработнай платы работнікаў бюджэтных арганізацый (без прэміі), якія дзейнічалі на момант увядзення новых умоў.

У адпаведнасці з пастановай для аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый з 1 студзеня 2020 года будзе прымяняцца базавая стаўка ў памеры 180 рублёў і новая 18-разрадная тарыфная сетка.

Базавая стаўка, якая ўстанаўліваецца Саветам Міністраў, будзе рэгулявацца цэнтралізавана, а такама стане асноўным эканамічным інструментам для вызначэння памераў акладаў (тарыфнай часткі аплаты працы) работнікаў бюджэтных арганізацый.

Памер базавай стаўкі будзе пераглядацца штогод, як правіла, з 1 студзеня, і вызначацца з улікам прагнозу асноўных параметраў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на адпаведны год.

Таксама ў адпаведнасці з Указам, з 1 студзеня 2020 года ўводзіцца тарыфная сетка з суадносінамі каэфіцыентаў 1-га і 18-га тарыфных разрадаў ад 1,00 да 3,00 і міжразраднай дыферэнцыяцыяй каэфіцыентаў тарыфных разрадаў у сярэднім 6 %.

Размеркаванне работнікаў па прафесійна-кваліфікацыйных групах будзе зроблена ў адпаведнасці з іх працоўнымі функцыямі (улічваючы складанасць і напружанасць працы, адказнасць спецыялістаў), а таксама кваліфікацыйнымі патрабаваннямі, што прад'яўляюцца да іх пасад.

Што датычыцца тарыфнай стаўкі першага разраду і 27-разраднай Адзінай тарыфнай сеткі работнікаў, то з 1 студзеня 2020 года яны страцяць сілу і ў далейшым прымяняцца не будуць.

У цэлым, як адзначаюць спецыялісты, прыняцце пастановы Саўміна № 138 з'яўляецца пачаткам работы па комплекснай змене сістэмы аплаты працы бюджэтнікаў.

**Святлана БУСЬКО.**

# Дзіцячая пляцоўка або таўнхаус: што важнейшае?

**Жыхары вёскі Дроздава Бараўлянскага сельсавета заклапочаны далейшым лёсам дзіцячай пляцоўкі. Пра гэта яны расказалі падчас прыёму грамадзян Мінскага раёна, які правёў старшыня Мінаблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА.**

Перадгісторыя пытання наступная.

У 2013 годзе Мінскі раённы выканаўчы камітэт зацвердзіў акт выбаркі зямельнага ўчастка для будаўніцтва шматкватэрных дамоў, заказчыкам выступала прыватная кампанія. Затым адмяніў гэтае рашэнне. У 2018-м забудоўшчык звярнуўся ў суд, які прыняў бок істца і перадаў яму зямлю пад узвядзенне таўнхаусаў.

Як растлумачылі заяўнікі, праблема ў тым, што надзел знаходзіцца на супрацьпажарным разрыве, які аддзяляе жылы масіў ад лесу. І тут нельга ўзводзіць капітальныя будынкі. Акрамя таго, гэты ўчастак першапачаткова прызначаўся для абсталявання сістэмы забеспячэння пасёлка вадой. Разам з тым, у 2013-м зямля з незразумелай прычыны адводзіцца прыватнаму забудоўшчыку. «Па заканадаўстве адзін і той жа ўчастак не можа быць выдзелены двойчы для двух аб'ектаў абсалютна рознага прызначэння. Тым больш што па ўзгадненні з Бараўлянскім сельвыканкамам плошча аддавалася пад дзіцячую пляцоўку, — рэзюмавалі жыхары. — Калі б участак сапраўды падпадаў пад капітальную забудову, то быў бы прададзены з аўкцыёну, паколькі на тэрыторыі сельсавета надта дарагая зямля».

У праект па абсталяванні дзіцячай пляцоўкі ўклалі значныя сумы кааператыў «Новае Дроздава» і прыватныя інвестары — адпаведна 5689 і каля 30 000 рублёў — і гатовы інвеставаць яшчэ. Аб'ект вельмі патрэбны пасёлку, паколькі тут пражывае шмат маладых сем'яў з дзецьмі. Але ў такім няпэўным становішчы жыхары сумняваюцца: ці варта далей траціць сродкі на будаўніцтва?

— Мы на баку людзей, якія пражываюць у Дроздаве: дзіцячай пляцоўцы быць, — запэўніў **старшыня Мінскага райвыканкама Іван КРУПКО.** — Ёсць рашэнне Бараўлянскага сельвыканкама аб выдзяленні і замацаванні пляцоўкі за кааператывам і пасёлкам. Пачалі абсталяванне і працягвайце.

Уласнікі жылля з прыватнага сектара вёскі Копішча паскардзіліся на тое, што пры забудове не захоўваюцца нормы па вышыні дамоў, якія планаваліся першапачаткова. У выніку замест пяціпавярховікаў з'яўляюцца дзесяціпавярховыя гмахі, якія перашкаджаюць камфортнаму пражыванню. Заяўніцы прасілі праверыць законнасць такіх падыходаў. Анатоль Ісачанка абяцаў разабрацца.

— Прыёмы грамадзян падштурхоўваюць нас да вырашэння пытанняў, якія хвалююць грамадскасць, — адзначыў пасля старшыня Мінаблвыканкама. — Сапраўды, у Копішчы праблемы ёсць, і мы пра іх ведаем. Неабходна правесці ў вёсцы рэвізію, спыніць будаўніцтва і ўзаконіць тыя аб'екты, што ўжо ўзведзены. Трэба пагладзець, дзе ў перспектыве будаваць дзіцячы сад, школу. Жанчыны просяць зменшыць ужо ўзведзеныя дамы, умоўна кажучы, з дзесяці да пяці паверхаў. Ці магчыма гэта? Яны ўведзены ў эксплуатацыю, і тут жывуць людзі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Пакістан заяўляе аб зніжэнні напружанасці ў адносінах паміж Нью-Дэлі і Ісламабадам



Міністр замежных спраў Пакістана Шах Мехмуд Курэшы заявіў, што назірае тэндэнцыю да дээскалацыі напружанасці ў адносінах паміж Індыяй і Пакістанам.

«Напружанасць у адносінах паміж Індыяй і Пакістанам, як відаць, зніжаецца, — заявіў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства. — Гэта пазітыўная падзея». «Пакістан яшчэ больш актывізаваў свае дыпламатычныя намаганні. У сувязі з гэтым мы вырашылі вярнуць пасла Пакістана ў Нью-Дэлі», — паведаміў міністр.

Курэшы таксама адзначыў, што ў пытанні зніжэння напружанасці паміж дзвюма дзяржавамі адыграла таксама ролю дапамога іншых краін — Кітая, Турцыі, Іарданіі.

### Дадон заявіў, што Малдова блізкая да вырашэння прыднястроўскай праблемы

Прэзідэнт Малдовы Ігар Дадон лічыць існуючую на гэты момант міжнародную абстаноўку спрыяльнай для вырашэння прыднястроўскай праблемы. Як ён заявіў учора, працэс пакуль тармозіцца толькі ў Кішынёве, дзе пасля выбараў павінен быць сфарміраваны новы ўрад.

«Я лічу, што справы тут могуць рухацца досыць хутка. Думаю, што для Расійскай Федэрацыі, для Еўрасаюза і ЗША гэты рэгіён мог бы быць добрым прыкладам вырашэння замарожаных канфліктаў. І мы блізка да вырашэння», — сказаў Дадон. «У новай канцэпцыі нічога не гаворыцца пра федэралізацыю краіны, на якой шмат спекулююць сёння. У аснове адзінай дзяржавы ляжыць збалансаваная знешняя палітыка і міжнародна прызнаны статус пастаяннага нейтралітэту. Без НАТА, замежных войскаў і г. д. Гэтая канцэпцыя была вельмі добра ўспрынята на Усходзе і Захадзе», — адзначыў прэзідэнт.

### Перад смерцю людзі бачаць адны і тыя ж сны

Спецыялісты амерыканскага Цэнтра хоспіснай і паліятыўнай дапамогі ў Бафала завяршылі 10-гадовае даследаванне і зрабілі даволі інтрыгуючае і загадкавае адкрыццё: аказваецца, незадоўга да смерці да людзей пачынаюць прыходзіць адны і тыя ж сны.

Назіраючы за паміраючымі пацыентамі, якіх за гэты час набралася больш за 13 тысяч, спецыялісты выявілі, што 88 % людзей напярэдадні скання бачаць неверагодна яркія сны.

Па словах пацыентаў, у 72 % выпадкаў у сне яны мелі зносіны з памерлымі сваякамі і сябрамі, адчуваючы пры гэтым цёплыя пачуцці. 59 % пацыентаў у сваіх апошніх снах пакавалі чамаданы або куплялі білеты — увогуле, збіраліся ў дарогу.

Загадкавыя сны пачыналіся прыкладна за 10—11 тыдняў да смерці, прычым іх частата імкліва павялічвалася, а сны станавіліся ўсё ярчэйшымі.

Святочнае

# МЕДЫКІ, БАЙКЕРШЫ, РАТАВАЛЬНІЦЫ,

актыўныя, дасведчаныя, неабыякавыя...

**Саракадвухгадовая жанчына з вышэйшай адукацыяй, гараджанка, працуе ў сферы паслуг, аховы здароўя, адукацыі, сацыяльных паслуг, актыўная карыстальніца інтэрнэту, фізічна актыўная. Гэта не аб'ява з сайта знаёмстваў, а партрэт сярэднестатыстычнай сучаснай беларускі. Больш за 53 % насельніцтва краіны — жанчыны, яны ж — палова тых, хто заняты ў эканоміцы. Прадстаўніцы прыгожай паловы сёння паспяхова займаюцца прадпрымальніцтвам, працуюць на кіруючых пасадах, ствараюць рабочыя месцы. Пра поспехі жанчын напярэдадні свята гаварылі спецыялісты.**

Уклад беларусак у жыццё грамадства і развіццё дзяржавы пастаянна павышаецца. Амаль палову арганізацый у краіне ўзначальваюць жанчыны, яны ж часцей за мужчын маюць вышэйшую адукацыю (кожная трэцяя), а кожная чацвёртая — сярэдне-спецыяльную.

— Сацыяльны і эканамічны статус жанчыны год ад году ўзрастае, і гэта заканамерна, таму што жанчыны — самая вялікая сацыяльна-дэмаграфічная група ў нашай краіне, — адзначыла **Марына АРЦЁМЕНКА, намеснік начальніка ўпраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны насельніцтва.** — Узрастанне статусу жанчын — гэта не стыхійны працэс. Больш за 25 гадоў у краіне мэтанакіравана рэалізуецца гендарная палітыка. Цяпер дзейнічае пяты нацыянальны план гендарнай роўнасці, разлічаны да 2020 года.

Для пашырэння эканамічных магчымасцяў жанчын і іх самазанятасці створаны розныя механізмы. Жанчыны, напрыклад, усё актыўней карыстаюцца магчымасцю атрымання бязвыплатных субсідый для адкрыцця ўласнай справы, запэўніла спецыяліст. Летась такіх стала амаль 45 %.

218 жанчын, якія знаходзяцца ў адпачынку па доглядзе за малым да трох гадоў, за апошнія два гады прайшлі бясплатную прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі.

Марына Арцёменка адзначыла важнасць зніжэння двайной занятасці жанчын на карысць развіцця асобаснага патэнцыялу. У краіне занятыя работай 84 % працаздольных жанчын, ходзяць на работу і 91 % тых, хто мае непаўналетніх дзяцей. Пры гэтым яны выконваюць двайную нагрузку, бо ўдвая больш часу трацяць на неаплатную працу па доме і догляд дзяцей.

**Ірына СІДАРОК.**



## У ЧЫМ ТВАЯ СІЛА, ЖАНЧЫНА?

Вобраз паспяховасці ў кантэксце мацярынства і сямейных каштоўнасцяў абмеркавалі на круглым стале ў Доме прэсы. «Кожная справа, да якой прычыняецца жанчына, мае душу і сацыяльны кірунак. У наш «меркантыльны» час гэта надзвычай важна», — упэўнены **намеснік міністра інфармацыі Ігар БУЗОЎСКІ.**

— Жаночыя твары мы бачым і ў журналістыцы, і ў прамысловасці, і ў парламенце. Хоць калісьці гэтыя сферы лічыліся выключна мужчынскімі. Прыемна, што беларускія жанчыны ў наш час не толькі хочуць быць сямейнымі, але і актыўна падключаюцца да развіцця грамадства на ўсіх узроўнях. Пры гэтым яны не імкнуцца да канкурэнцыі. Хочуць быць у тандэме з прадстаўнікамі супрацьлеглага полу. Мужчыны дзейнічаюць цвёрда і рашуча, жанчыны — мякка і асцярожна. Калі гэта аб'яднаць, атрымаем тую самую гармонію, якая прывядзе да поспеху ў любой справе, — выказала думку **намеснік старшыні Беларускага саюза жанчын Лілія АНАНІЧ.**

Назіраннямі за сітуацыяй збоку падзялілася **пастаянны каардынатар ААН у Беларусі Іаана КАЗАНА-ВІШНЯВЕЦКІ:**

— У вас даволі высокі ўзровень не толькі правоў, але і магчымасцяў жанчын. Нягледзячы на тое, што тут па-ранейшаму захоўваюцца традыцыйныя мадэлі выхавання дзяцей (у дэкрэт ідзе толькі адзін працэнт мужчын), значны ўплыў на развіццё эканомікі краіны аказвае менавіта прыгожая палова. Гэта цудоўна. Навуковыя даследаванні паказалі, што бізнес, у кіраванні якога не менш за 30 працэнтаў займаюць жанчыны, развіваецца больш паспяхова, чым чыста мужчынскі. Такія кампаніі хутчэй растуць, зарабляюць больш грошай і распрацоўваюць эфектыўныя стратэгіі.

А на думку **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Людмілы КАНАНОВІЧ**, паспяховасць жанчыны можна вымяраць толькі як суму складаемых:

— Гэта нязменныя каштоўнасці — сям'я, дзе жанчына рэалізуе сябе ў ролях жонкі, мамы, бабулі, і любімая справа, якая дае магчымасць раскрыцца творчым і працоўным здольнасцям. У дзяржаве створаны ўмовы, каб кожная жанчына магла рэалізаваць сябе ў абодвух кірунках.

**Ганна КУРАК.**

ТЭЛЕФАНУЙЦЕ Ў СУБОТУ!

**Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 9 сакавіка ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. Тэлефонныя лініі ў суботу з 9.00 да 12.00 праводзяць:**

* намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;

* намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

* намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

* кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;

* намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Віктар Уладзіміравіч НЕКРАШЭВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

* кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

* намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Пятровіч КРЭПАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

Сугучча

# БУДЗЕМ СЯБРАВАЦЬ КНІГАМІ

Тры дні творчых сустрэч з пісьменнікамі, прэзентацый і абмену вопытам з прафесіяналамі кніжнай галіны, удзельнікі з васьмі краін свету, больш як 49 прэзентацый, 150 культурных мерапрыемстваў і 16 367 наведвальнікаў — дэбют Беларусі ў Латвійскім кніжным кірмашы аказаўся багатым на ўражанні, прапановы і перспектывы.

«Кожная замежная кніжная выстаўка для нас — гэта не толькі пэўны карысны вопыт, выбудоўванне стратэгіі і планаў развіцця айчыннага кнігавыдавецтва і кнігараспаўсюджвання, але таксама, як бы пафасна гэта ні гучала, прасоўванне Беларусі ў свеце», — адзначыў **кіраўнік беларускай дэлегацыі, намеснік міністра інфармацыі Ігар БУЗОЎСКІ.**

Сёлета Латвійскі кніжны кірмаш, які праходзіў 1—3 сакавіка ў Рызе з удзелам прадстаўнікоў Латвіі, Літвы, Беларусі, Расіі, Украіны, Чэхіі, Германіі і Турцыі, быў спалучаны з так званай школьнай адукацыйнай выстаўкай. Дзякуючы такому суседству на кніжныя стэнды зазірнула маладая публіка, а асабліва папулярнасць мела адукацыйная літаратура — у прыватнасці, развіваючыя кнігі для дзяцей, кнігі па беларускім фальклоры і культуры наогул, альбомныя выданні. Яшчэ адной цікавінкай выстаўкі для прадстаўнікоў Беларусі стала абмеркаванне абмену паміж навучальнымі ўстановамі розных краін вучэбнай літаратурай у электронным выглядзе.

Экспазіцыю Беларусі наведалі многія прадстаўнікі нацыянальнай дыяспары ў Латвіі. Акрамя таго, у межах кніжных выстаўкі адбылася перадача чатырох бібліятэчак беларускіх кніг, прыкладна па 220 асобнікаў у кожнай, зацікаўленым структурам. Напрыклад, адну такую бібліятэчку атрымала ў падарунак Рыжская асноўная беларуская школа імя Янкі Купалы, у якой дзеці вучацца на беларускай мове, яшчэ адну — Елгаўскае беларускае таварыства «Лянок», а каля 70 кніжных навінак, якія экспанаваліся на стэндзе, былі перададзены пасольству нашай краіны ў Латвійскай Рэспубліцы. Дасягнутая дамоўленасць аб перадачы да канца года падобнай бібліятэчкі і беларускаму цэнтру Акадэмічнай бібліятэкі Латвійскага ўніверсітэта.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Камунальныя стасункі

# ЗА НЯЯКАСНЫЯ ПАСЛУГІ СПАЖЫЎЦЫ ЗАПЛАЦЯЦЬ МЕНШ

**Жыллёва-камунальныя паслугі (ЖКП), якасць якіх не адпавядае патрабаванням, нарматывам і параметрам, павінны аплачвацца адпаведна. Зменены парадак пераразліку платы за «некандыцыю», паслугі з грубымі парушэннямі ці ўвогуле невыкананыя абавязкі камунальнікаў адаб'юцца і на іх кішэнях. Навацыяй, якія зробяць адказнасць за ЖКП больш жорсткай, замацаваны ў адпаведным дакуменце.**

### ВЯРНУЦЬ 30 % ЗА ВАДУ

Дакумент павінен падштурхнуць пастаўшчыкоў паслуг да больш якаснай работы, а ў жыхароў — выхаваць адчуванне ўласніка, лічыць **Генадзь АКСЦІЛОВІЧ, прэс-сакратар Міністэрства ЖКГ:**

— Добрасумленны спажывец, атрымліваючы «жыроўку», прывык спраўна плаціць па рахунках. І нават калі ён незадаволены якасцю абслугоўвання, стрымлівае эмоцыі. Часцей спажывец выплюхвае свае пачуцці ў зваротах і скаргах. То ў кватэры горача, то вада недагрэтая, то ў пад'ездзе брудна. Цяпер адносіны пастаўшчыкоў і спажыўцоў пяройдуць у эканамічную плоскасць.

Раней за няякасную ваду ў краіне сям'я з трох чалавек, якая жыве ў двухпакаёвай кватэры, магла атрымаць назад крыху больш за рубель, бо памер пераразліку складаў 10 % ад кошту вады. Сёлета і ў наступным годзе, калі вада не адпавядае санітарным нормам, гэты памер застанецца на ранейшым узроўні ў 10 %, але далей будзе павышацца паэтапна: у 2021—2022 — на 15 %, у 2023-м — на 20, у 2024-м — на 25, у 2025-м — на 30 %.

— Стратэгія плаўнага павелічэння пакідае для водаканалаў магчымасць мадэрнізаваць выторчасць. Збудаваць станцыі абезжалезвання, памяняць абсталяванне на свідравінах, рэканструяваць ачышчальныя збудаванні, — заўважыў прэс-сакратар. — Прадпрыемствы, якія не захочуць выкарыстаць гэты час для ўдасканалення сваёй працы, у прамым сэнсе разлічацца за гэта рублём.

Пераразлік за ваду можна зрабіць і тады, калі яна пастаўлялася з перапынкамі. Калі па працягу месяца ваду адключалі больш як двойчы на тэрмін, які перавышае час, адведзены на гэта нарматыўнымі дакументамі, можна патрабаваць памяншэння на 10 % аплаты за ўвесь месяц. Згодна з дакументам, разліковы час на ліквідацыю аварый — ад 8 да 24 гадзін.

### ПЛАЦІЦЬ АДНО ЗА 24 °С

Новы дакумент прадугледжвае норму, згодна з якой пераналагараванне памяншаннем, калі жыхарам прыходзіцца не зачыняць форткі ледзьве не суткамі, бо ў кватэрах надта горача, стане праблемай не людзей, а пастаўшчыка паслугі. Цяпер уласнік можа плаціць толькі за цяпло, якое павінна даваць у кватэры +24 °С. Астатнія выдаткі за празмернае ацяпленне — калі тэмпература звыш 24 градусаў трымаецца больш як суткі, — клопат вытворцы цеплыні.

Магчымасць заплаціць менш за ацяпленне, калі ў кватэры, нагадварот, холадна — больш за суткі тэмпература не падымаецца да +18 °С.

### СМЕЦЦЕ, УБОРКА І ГАЗ

Недаплачваць за вываз смецця, як і раней, можна за столькі дзён, колькі адходы не забіралі. Аднак цяпер гэта рабіць можна адпаведна са схемамі абарачэння з адходамі на тэрыторыі пэўнага населенага пункта. А ўмовы вывазу смецця ва ўсіх розныя: штодня ці некалькі разоў на тыдзень, і зацвярджаюцца мясцовымі выканкамамі.

— Калі адходы, згодна са схемай, павінны былі вывезці, умоўна, шэсць разоў за месяц, а фактычна вывезлі пяць, то плата за вываз смецця паменшыцца на адзін раз, — растлумачыў Генадзь Аксціловіч. — З маршрутнымі графікамі абслугоўвання жылых дамоў можна азнаёміцца ў абслугоўваючай арганізацыі.

Такі ж прынцып дзейнічае і адносна ўборкі пад'езду і месцаў агульнага карыстання. Калі па графіку ўборка павінна была адбыцца, а на справе не мялі і не мылі, і хтосьці з жыхароў заявіў пра гэта, усе кватэры атрымаюць пераразлік.

Менш на 10 % заплацяць спажыўцы і ў выпадку, калі больш як на суткі зацягнуўся рамонт газавых ці электрычных сетак.

**Ірына СІДАРОК.**

## ПЕНСІЮ ВЫПЛАЦЯЦЬ ДАТЭРМІНОВА

**Выплата пенсій і дапамог за 8 сакавіка пачалася ў аддзяленнях паштовай сувязі Мінска і Брэсцкай вобласці ўжо 5 сакавіка. Пра гэта паведамляе прэс-служба Белпошты.**

6 сакавіка пачалі ажыццяўляцца выплаты ў аддзяленнях паштовай сувязі Віцебскай і Мінскай абласцей. Што датычыцца Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей, то ў іх пенсію можна атрымаць 7 сакавіка. 8 сакавіка будуць функцыянаваць толькі дзяжурныя аддзяленні пошты. Падрабязнасці рэжыму работы паштовых аддзяленняў можна даведацца ў Call-цэнтры Белпошты па нумары 154.

**Святлана БУСЬКО.**

Надвор'е

# 3 ветрам, але цёпленька

8 сакавіка да нас завітаюць больш цёплыя паветраныя масы. У пятніцу месцамі па краіне пройдзе кароткачасовы дождж. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 цяпла, па поўдні — плюс 8—9 градусаў. Удзень — ад плюс 6 да плюс 13 градусаў, па паўднёвым усходзе —15 цяпла. У суботу месцамі па краіне мокры снег і дождж, узмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, па паўднёвым усходзе — 5—6 цяпла. Удзень будзе ад плюс 2 па поўначы да плюс 10 градусаў па поўдні краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у нядзелю на большай частцы тэрыторыі краіны чакаецца мокры снег з дажджом. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, па паўднёвым захадзе — 4—5 цяпла. Максімальная тэмпература днём будзе не вышэй за плюс 2—9 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# НА ФЕРМУ — З УКЛАДКАЙ І МАКІЯЖАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Імправізаваны салон прыгажосці з выездам у глыбінку — сумесная ініцыятыва Беларускага саюза жанчын і прафсаюза работнікаў АПК.

— Ідэя праекта нарадзілася некалькі месяцаў таму, калі я знаёмілася з жывёлаводамі-перадавікамі Добрушскага раёна. Увагу прыцягнулі напрацаваныя рукі без намёку на манікюр, твары, якія ўжо і забыліся, што такое пудра, — расказвае **старшыня Гомельскай абласной арганізацыі БСЖ Галіна ПАШЭД.** — Праца даярак і цялятніц нялёгкая. Але жанчына застаецца жанчынай, нават калі знаходзіцца на ферме. 8 Сакавіка — ідэальны час, каб нагадаць пра гэта.

Работніцы фермаў нечаканаму падарунку толькі радыя. Навіна пра салон прыгажосці ў Насовічах абляцела ўсе навакольныя вёскі. Жанчыны пачалі падцягвацца ў ДК адразу пасля работы. Самая вялікая чарга выстраілася, вядома, да цырульнікаў. У вёску некалькі разоў на тыдзень прыязджае майстар з Добруша, але да яго сельскія жанчыны даходзяць нячаста. Пакуль з фермы прыйдзеш, пераапранешся — ужо і назад трэба вяртацца, каровы чакаць не будуць. Жывёлаводы элементарна не паспяваюць пастрыгчыся. Што ўжо казаць пра вячэрнія ўкладкі? Таму ў гэты дзень у клубе для годнага сэрвісу стварылі ўсе ўмовы. Нават вялізную бочку з цёплай вадой прывезлі, бо водаправод да будынка не падведзены.


Іна Калеснікава ў «салоне»...


...і на працы.

— Я заўсёды думала, што даярка з касой да пояса — гэта такі стэрэатып, — кажа майстар па прычосках Ірына Машэчка. — Аказалася, праўда. У многіх сапраўды доўгія густыя валасы, з якімі прыемна працаваць.

Дзяўчаты ў сваю чаргу тлумачаць, што на ферму або з зусім кароткімі валасамі ідзеш, або з доўгімі, якія можна акуратна заплесці і схаваць пад хустку.

— Ну няўжо мая Валя — цялятніца? Не. Мадэль яна! Гляньце на прычоску, на вусны. Ёй бы на вокладку часопіса мод, — не хаваючы эмоцый прызнаецца Ала Карпенка.

Жанчына прыйшла да стылістаў разам з дочкамі — Валянцінай Чмыровай і Таццянай Бабровай. Усе трое працуюць жывёлаводамі на мясцовых фермах.

— Іванаўна, давай і з цябе мадэль зробім!

— Куды мне... Я старая жанчына — 57 гадоў, — адмахваецца Ала.

Аднак пасля доўгіх угавораў усё ж ідзе ў крэсла да візажыста. Упершыню ў жыцці. 20 хвілін «чараўніцтва» пэндзлікамі, ценямі і румянамі — і вуаля. Перад намі ўжо не стомленая сялянка, а дама, гатовая скарыць мужчынскія сэрцы.

А вось на манікюр з тутэйшых жанчын адважыліся нямногія.

— Шкада людской працы. Майстры будуць старацца над маімі пазногцямі, а я раз кармушку пачышчу — і таго манікюру як не было, — тлумачыць цялятніца Надзея Пінкіна.

Апаратар па штучным асемяненні Вольга Муха не згодная — лічыць, што хоць на нядоўгі час, але прыгажосць павінна дакранууца да яе рук.

— Дома ўсе здзівяцца, калі я ім сваe пазногцікі пакажу, — кажа яна майстру па манікюры.

Муж у Вольгі таксама на ферме. А паколькі пара гадуе чацвярых дзяцей, пра час на сябе жанчына пакуль толькі марыць.

— У маладосці хацела стаць сюардэсай, але закахалася — і закруцілася ўсё неяк. Дом, сям'я, работа. Я, калі прыйшла, жудасна баялася. Але нічога, хутка ўвайшла ў курс справы і разумею, што адказнасці тут не менш, чым на авіялайнеры, — расказвае жывёлавод.

Побач яе калега Наталля Мініна разглядае сябе ў люстэрку.

— Якія адчуванні? Цяжкавата. Столькі касметыкі на твар я за ўсё жыццё не наносіла. Але дайце ж хоць раз адчуць сябе сапраўднай зоркай!

Усяго за некалькі гадзін вясковыя жанчыны пераменіліся да непазнавальнасці. Прычоскі і макіяж — гэта ж не толькі пра новы твар, але і пра новыя адчуванні. Спінкі ва ўсіхураз сталі роўныя, погляды адкрытыя. Яно і зразумела: новаму вобразу хочацца адпавядаць.

— Прыйду на ферму, а мяне мае кароўкі не пазнаюць, — дзеліцца Ала Карпенка.

У гэтых словах ні кроплі іроніі. А палове першай жывёлаводы павінны былі вярнуцца да працоўных абавязкаў. Але перад тым, як збегчы назад на ферму, — яшчэ адзін сюрпрыз. Якое ж свята без канцэрта і падарункаў? Кветкі, касметыка, салодкія ласункі — надарылі дзяўчатам усё тое, перад чым не ўстаіць ні адна жанчына. Акрамя першых асоб раёна і сельсавета, павіншаваць жывёлаводаў прыйшла легендарная Валянціна Канстанцінаўна Кляцко — чалавек, які працуе ў сельскай гаспадарцы Добрушскага раёна ўжо 52 гады і служыць прыкладам не аднаму пакаленню аграрыяў.

— Прыгажосць, вядома, страшная сіла. Але калі надоі сёння ўпадуць, нікога шкадаваць не буду. Пасля канцэрта — усе на фермы без спазненняў, а то прэміі паздымаем! — жартаўліва пачала сваё выступленне жанчына, а пасля ўжо ўсур'ёз зазначыла: — Словамі не перадаць, як у сельскай гаспадарцы не любяць сакавік і красавік! Звычайна людзі радуюцца пачатку вясны, а ў нас кармы на зыходзе, паўсюль слота і бруд. Прыемна, што менавіта пра нашых дзяўчат не забыліся ў гэты час. Мы працуем для тых, хто дае нам культуру і медыцыну, хто задзейнічаны ў прамысловасці і адукацыі. Адным словам, для ўсіх. І калі мы не будзем сумленна ставіцца да сваёй справы, не накормім людзей — няма чаго і ад іх чакаць высокіх дасягненняў.

## ПАСЛЯ БАЛЮ

І ўсё ж самае цікавае ў той дзень рабілася не ў Доме культуры, а на гаспадарках, куды жывёлаводы адправіліся адразу ж пасля імправізаванага салона прыгажосці. Нагадвала гэтая карціна казку пра Папялушку — святочныя сукенкі змяніла працоўнае адзенне, а прычоскі схаваліся пад хусткамі.

На фермах дзяўчат зачакалася не толькі жывёла, але і мужчынская палова калектыву. Так-так, у «Чырвонай Будзе» працуе цэлых сем мужчын-аператараў машыннага даення! Нічога дзіўнага, улічваючы, што некалі гэтыя мясціны праслаўляў знакаміты Герой Сацыялістычнай працы — даяр Косця Хлябцоў. Гэта ягоныя паслядоўнікі. Дарэчы, дзякуючы мужчынам, жанчыны і змаглі на некаторы час адлучыцца з фермы дзеля наведзення марафету. Кароў адных не пакінеш.

— Мы з хлопцамі падняліся а палове чацвёртай раніцы. На гадзіну раней, чым звычайна, запусцілі дойку, каб паспець упраўляцца да васьмі, — дзеліцца памочніца брыгадзіра Антаніна Кудрыцкая. Яна адна з нямногіх, у каго не атрымалася патрапіць да цырульнікаў: — Нехта ж павінен быў усё арганізаваць і прасачыць за працэсам.

Старанні гомельскіх майстроў Антаніна Іванаўна ацаніла на выдатна: «Ох, якія нашы дзеўкі харошанькія! Пабачыць кароў і ўсё-ўсё мне раскажуць. Я нават кубачкі фарфоравыя для чаю прынесла. Зладзім працяг свята на ферме». Ну чым не «фея-хросная», якая дапамагла сваім падапечным трапіць у казку?

Перамены ў сваіх гаспадынях заўважылі і рагулі. Спачатку прынюхваюцца, прыглядаюцца, і толькі пачуўшы родны голас, падыходзяць бліжэй. Затое самі жанчыны адчуваюць сябе ў новых вобразах надзвычай арганічна і не саромеюцца пазіраваць на камеру. Цікава, што ў Доме культуры сярод незнаёмых людзей, пад пільным наглядам дзясятка журналістаў іх трэба было прасіць усміхнуцца, кожная фраза давалася няпроста. А тут іх быццам падмянілі: водзяць мяне па ферме, расказваюць пра ўсё. Вось што значыць, чалавек на сваім месцы.

— Гэта нашы самыя маленькія, нарадзіліся некалькі дзён таму. Прычым кожная з нас корміць цялят толькі ад тых кароў, якіх доіць. Мы нават называем гэтых цялят сваімі прозвішчамі, — знаёміць з тонкасцямі працы даярка Іна Калеснікава. — А тут у нас іх мамы. Вы толькі ў вочы зазірніце, ну як іх можна баяцца і не любіць?

**Ганна КУРАК, фота аўтара.**


### К СВЕДЕНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО «БелВитунифарм»

Очередное собрание акционеров состоится 25 марта 2019 года в 12.00 по адресу: Витебская область, Витебский район, дер. Должа, ул. Советская, д. 26А, актовый зал. Регистрация участников будет осуществляться по указанному выше адресу, время регистрации участников собрания пройдет в день проведения собрания с 9.00 до 11.45. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность. Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 1 марта 2019 г.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

| № п/п | Формулировка вопроса повестки дня |
|---|---|
| 1 | Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2018 год. Отчет директора, дирекции о работе в 2018 году |
| 2 | Отчет Наблюдательного совета о работе в 2018 году. Отзыв наблюдательного совета о годовом балансе Общества |
| 3 | О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансовой и хозяйственной деятельности Общества за 2018 год |
| 4 | Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках (данных книги учета доходов и расходов) Общества за 2018 год |
| 5 | О распределении прибыли, остающейся в распоряжении Общества (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2018 год |
| 6 | Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении Общества, на 2019 год |
| 7 | Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества на 2019 год |
| 8 | Об утверждении размеров вознаграждения членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии |
| 9 | Об установлении вознаграждения членам Наблюдательного совета на 2019 год |
| 10 | О создании в Ташкентской области совместного предприятия по производству ветеринарных препаратов |

С материалами внеочередного собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник – пятница), начиная с 15 марта 2019 г., по месту нахождения Общества в кабинете начальника отдела правовой и кадровой работы с 08.00 до 16.00.

Тел. 8 0212 209390.

Наблюдательный совет ОАО «БелВитунифарм».

УНП 811001710



### ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Свирь-агро» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:

**Лот № 1: (повторный аукцион): здание мастерских инв. № 633/С-10266 общей площадью 884,1 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 624087408101000251 площадью 0,2982 га по адресу: Минская область, Мядельский район, Свирский с/с, д. Комарово, ул. Зеленая, д. 18Б.** *Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: водоохранная зона ручья № 28 (0,2982 га); придорожная полоса автомобильной дороги (0,2982 га); зона охраны недвижимых материальных историко-культурных ценностей (0,2982 га); охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 Вольт (0,0008 га).*

Начальная цена объекта с НДС (20 %) **– 12 180,00 бел. руб.** Задаток 10 % от начальной цены – **1 218,00 бел. руб.** Стоимость снижена на **50 %.**

**Лот № 2: здание нежилое, инв. № 633/С-13898, общей площадью 791,2 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 624087408101000253 площадью 0,2499 га по адресу: Минская область, Мядельский район, Свирский с/с, д. Комарово, ул. Полевая, 1.** *Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: водоохранные зоны рек и водоемов, площадь – 0,2499 га; охранные зоны электрических сетей, площадь – 0,0,0124 га.*

Начальная цена объекта с НДС (20 %) – **49 320,00 бел. руб.** Задаток 10 % от начальной цены – **4 932,00 бел. руб.**

**Установлены типовые условия продажи объектов:**

– улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества;

– поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);

– обращение в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество (в случае отчуждения незарегистрированного объекта – с даты подписания акта приема-передачи) в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ (в случае необходимости ее разработки) либо информирование соответствующего исполнительного комитета в указанный срок об отсутствии такой необходимости;

– разработка проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством;

– проведение реконструкции (строительства) недвижимого имущества в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2 лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество, если иное не установлено решением районного исполнительного комитета;

– использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством;

– запрет на отчуждение недвижимого имущества до его ввода покупателем в эксплуатацию.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в следующем размере: по лоту № 1 в размере 10 (десяти) процентов, по лоту № 2 – 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **09.04.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.04.2019** до **16.00** по указанному адресу.
**Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

Прачытаў — перадай другому *Сумесны праект газеты «Звязда» і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

# МУЗЫ З ВІНТОЎКАМІ

**«8 сакавіка 1943 года жанчыны ўсяго свету сустракаюць у абстаноўцы жорсткіх бітваў з азвярэлым фашызмам. Савецкі народ і разам з ім працоўныя жанчыны ў гэтыя суровыя дні поплеч з мужчынамі адстойваюць гонар і свабоду сваёй Радзімы... У барацьбе з фашыстам выраслі дзясяткі і сотні гераінь савецкага народа, жанчын і дзяўчат, якія пакрылі сябе неўвядальнай славай. Народ ведае імёны гераінь-партызанак: Зоі Касмадзям'янскай, Лізы Чайкінай, Ані Пятровай і многіх іншых. Яскравыя прыклады патрыятызму і бясстрашнасці праявілі жанчыны на ўсіх участках фронту і тылу. Яны ўзводзілі барыкады пад Ленінградам і ў Севастопалі, капалі супрацьтанкавыя равы пад Масквой, тушылі пажары, пад разрывамі бомбаў працавалі каля станкоў, пад градам куль выносілі з поля бою раненых байцоў і самі ў патрэбную хвіліну свінцовым дажджом знішчалі акупантаў. Такіх гераінь у нас тысячы», — гэта тэкст з перадавіцы нумара «Бобруйского партизана» за 8 сакавіка 1943 года. Толькі па афіцыйных звестках Беларускага штаба партызанскага руху, удзельніцамі партызанскіх атрадаў былі як мінімум 45 242 беларускія жанчыны — і гэта без уліку тысяч агентурных разведчыкаў і сувязных. І безумоўна, пра іх — маці, жонак, сясцёр, дачок, паплечніц і сяброваў, гераінь і ахвяр Вялікай Айчыннай — таксама пісалі падпольныя і партызанскія выданні.**

## «ХОЧАШ БЫЦЬ СВАБОДНАЙ — ІДЗІ Ў ПАРТЫЗАНСКІ АТРАД»

Паводле даведкі, складзенай Беларускім штабам партызанскага руху ў 1946 годзе, на снежань 1942-га ў партызанскіх фарміраваннях на акупаванай тэрыторыі Беларусі знаходзіліся ўсяго 576 жанчын — альбо 5,3 % ад усяго асабовага складу, аднак ужо летам гэта колькасць павялічылася больш як у пяць разоў, і далей тэндэнцыя захавалася. Найчасцей жанчыны сыходзілі ў лясы, да партызан у тагачасных Мінскай, Віцебскай і Баранавіцкай абласцях. Звязана ж гэта было перадусім з практыкай вярбоўкі ў Германію, якую нацысты асабліва пашырылі ў 1943 годзе: у рэйх адпраўляліся цэлыя эшалоны з бясплатнай рабочай сілай... А адтуль потым даходзілі да родных хіба гаротныя лісты, якія перадрукоўвалі і распаўсюджвалі ва ўлётках беларускія падпольшчыкі. «Хлеб атрымліваем два разы ў дзень па 100 грамаў. Працуем па 12 гадзін у дзень. Апрача завода і баракаў нічога не ведаем. За кароткі час нашага жыцця тут мы ўсе выбіліся з сіл, недасыпаем, недаядаем, — прыводзіць ліст Ноны Г. ад 8 кастрычніка 1942 года агітплакат «Раздавім фашысцкую гадзіну». — У маленькім пакоі нас 16 чалавек, усе ўкраінкі і я. Калі прыдзецца ўбачыцца, то раскажу ўсё. Але ўбачыцца бадай ці давядзецца, таму што зімаваць застаемся ў летніх бараках з дошак. Пры такім харчаванні, ды без сну, ды голай і босай не выжыць мне...» Побач надрукаваны допіс вясковай дзяўчыны з Віцебшчыны: «Мяне білі дзесяць разоў, два разы кідалі ў халодны склеп за тое, што я ўзяла на панскай кухні тры бульбіны — не магла стрываць голаду. Вы памятаеце Зоську з вёскі Навойкі? Яна не вытрымала здзекаў, памёрла. Вера, Балабіных дачка, па дарозе ў Германію захварэла на тыф, і нямецкія звяругі расстралялі яе. Забілі немцы і маю сяброўку Зіну толькі за тое, што яна намервалася пайсці ў суседні маёнтак, так як даведалася, што там працэ яе дваюрадная сястра. На кожным кроку мы бачым тут смерць, слёзы, пакуты нашых людзей. Ой, як цяжка і балюча мне, родныя мае!»

**5.** Общий объем седьмого выпуска жилищных облигаций Эмитента составляет 591920,00 белорусских рублей. Количество эмитируемых облигаций составляет 392 штуки. Номинальная стоимость жилищной облигации седьмого выпуска составляет 1510,00 белорусских рублей и имеет эквивалент номинальной стоимости равный одному метру квадратному общей площади жилого помещения в строящемся жилом доме № 5 в составе объекта «Многоэтажные жилые дома в дер. Озерцо Щомыслицкого сельсовета. Корректировка», 8-я очередь строительства.

**6.** Исполнение обязательств Эмитента по жилищным облигациям седьмого выпуска обеспечивается залогом недвижимого имущества, принадлежащего Эмитенту на праве собственности. Указанное обеспечение действует в течение всего срока обращения жилищных облигаций, а также в течение трех месяцев после окончания срока обращения жилищных облигаций.

**7.** Номер счета Эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при размещении жилищных облигаций: текущий счет № BY81BAPB30122497500170000000 в Региональной дирекции по г. Минску ОАО «Белагропромбанк» БИК BAPBBY2X.

**9.** Депозитарное обслуживание Эмитента осуществляет депозитарий – Республиканское унитарное предприятие «Республиканский центральный депозитарий ценных бумаг».

Юридический и почтовый адрес депозитария Эмитента: 220004, г. Минск, ул. Мельникайте 2, 4-й этаж;

Дата и регистрационный номер депозитария Эмитента как юридического лица, наименование регистрирующего органа: Мингорисполком, № 100967318 от 06 марта 2003 года; номер специального разрешения (лицензии) № 02200/5200-4-1111 на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выданное Министерством финансов Республики Беларусь.

**10.** С более подробной информацией и с проспектом эмиссии жилищных облигаций можно ознакомиться в открытом акционерном обществе «Интертраст групп» по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, д. 28А, комн. 513.

Директор И. В. Иванская

Главный бухгалтер А. А. Карпеко

## Извещение о проведении 9 апреля 2019 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк»

Сведения о продаваемом имуществе:

| Лот | Информация о предмете торгов | Цена продажи, руб. с НДС 20 % | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|
| № 1 | Здание гаража общей площадью 56,6 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 622850100001000021, 622850100001000022 площадью 0,1108 га. Местоположение: Минская обл., Копыльский р-н, г. Копыль, ул. Тепловая, д. 2В | 16817,16 | 1681,72 |

**Продавец имущества:** Открытое акционерное общество «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.

**Организатор торгов**: Консалтинговое унитарное предприятие «Агробизнесконсалт», 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, к. 1703.

Торги проводятся в форме аукциона в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и условиями проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк».

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

– заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет Консалтингового унитарного предприятия «Агробизнесконсалт» BY23BAPB30122013100380000000 в ОАО «Белагропромбанк» БИК BAPBBY2X г. Минск, УНП 190982374 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в условиях проведения торгов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается не ранее чем через 45 календарных дней и не позднее чем через 70 календарных дней со дня проведения торгов.

**Торги проводятся 9 апреля 2019 года в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, д. 22, офис 1703.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 07.03.2019 по 05.04.2019 включительно, в рабочие дни с 08.30 до 12.30 и с 13.15 до 16.00, по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 22-1703.

Получить дополнительную информацию и ознакомиться с документацией по условиям и предметам торгов можно на сайте www.zalogbanka.by, mail: torgi@agroconsult.by

Организатор аукциона: Tel./Fax (017) 399 66 39, GSM MTS (029) 816-64-46, GSM VEL (044) 540-64-46.

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень



**АВЕН.** Нават калі вы незадаволеныя сабой і сітуацыяй, якая склалася, паспрабуйце знайсці станоўчыя моманты і захоўвайце душэўную раўнавагу. Перашкоды — гэта вынік вашых спроб выйсці на новы ўзровень жыцця, да чаго вы павольна і ўпэўнена рухаецеся. У панядзелак і сераду пажадана не абцяжарваць накавольных сваімі клопатамі. Не задавайце занадта шмат пытанняў — чым больш іх будзе, тым мацнейшым будзе расчараванне.



**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні самай важнай задачай будзе здабыццё ўплывовых сяброў і атрыманне дакладнай інфармацыі. У панядзелак лепш заняцца завяршэннем няскончаных спраў, асабліва дробных. Аўторак можа аказацца паспяховым днём для вырашэння дзелавых пытанняў і вядзення перагавораў. У суботу лепш не давяраць выпадковым знаёмым, ды і з членамі сям'і быць больш асцярожным. У гэты дзень вялікая магчымасць свару і разрыву даўніх адносін.



**БЛІЗНЯТЫ.** На гэты тыдзень не варта планаваць нічога сур'ёзнага, акрамя, вядома, неадкладных працоўных спраў і пытанняў, якія датычацца здароўя, — гэта заслугоўвае самага сур'ёзнага падыходу. У канцы тыдня вас чакае нешта асаблівае і рамантычнае. Каханы чалавек рыхтуе прыемны сюрпрыз — абяцаюць зоркі.



**РАК.** Паклічце на дапамогу вашу працаздольнасць, добрасумленнасць і пунктуальнасць, і вы будзеце асуджаныя на поспех. Вы цяпер вельмі дыпламатычныя і здолееце знайсці агульную мову з начальствам. У выхадныя прадстаўнікі супрацьлеглага полу пацешаць вас сваёй увагай. Зможаце цудоўна правесці час побач з блізкімі.



**ЛЕЎ.** На гэтым тыдні пашырацца вашы магчымасці ў бізнесе і кар'еры, аднак давядзецца браць на сябе адказнасць, асабліва калі займаеце кіруючую пасаду. Калі ж вы не ўпаўнаважаны вырашаць нешта асабіста, выкажыце свае ідэі начальству, і да вас абавязкова прыслухаюцца. Толькі не перагружайце сябе працай і не ўзвальвайце ўсе хатнія клопаты на свае плечы.



**ДЗЕВА.** Тыдзень пройдзе ў працы і мітусні. Толькі ў пятніцу наступіць час, спрыяльны для падвядзення некаторых вынікаў, падліку і аналізу прыбытку і страт. Паспрабуйце да гэтага дня завяршыць справы, якія паддаюцца завяршэнню. У вольны ад працы час вам варта сур'ёзна заняцца ўладкаваннем свайго жылля, прыбярыце ўсё лішняе і непатрэбнае. Прыўнясіце адчуванні навізны і арыгінальнасці ў сваё жыццё.



**ШАЛІ.** На гэтым тыдні вы будзеце шмат кантактаваць з людзьмі, але паспрабуйце пры гэтым не сварыцца і публічна не высвятляць адносіны. Зоркі прадказваюць, што вы будзеце разрывацца паміж прафесійнымі абавязкамі і сямейнымі справамі. У панядзелак калегі могуць плесці супраць вас сетку інтрыг, не абвастрайце адносіны. У чацвер пажадана нікуды не спяшацца, бо з такіх дробязяў можа складвацца ваша рэпутацыя. Выхадныя лепш правесці ў коле сяброў.



**СКАРПІЁН.** На гэтым тыдні ў вас будуць усе магчымасці для паспяховай самарэалізацыі на працы і атрымання дадатковага прыбытку. Каб дамагчыся пастаўленай мэты, ёсць сэнс аб'ядноўвацца з іншымі людзьмі. Прыйшоў час задумвацца пра рэалізацыю вашых любоўных імкненняў і эратычных жаданняў. Зоркі абяцаюць вельмі рамантычныя выхадныя.



**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні будзьце цвёрдыя і паслядоўныя, спадзявайцеся толькі на свае сілы. Аўторак можа аказацца эмацыянальна напружаным днём, калі лепш абмежавацца роляй назіральніка. Пачынаючы з серады ў справах азначаюцца добрыя перспектывы. Сіл і энергіі таксама дадасца. Варта задумацца пра сваё стаўленне да людзей, магчыма, вы схільныя патрабаваць залішне шмат. Той, хто зусім нядаўна здаваўся ледзь не ідэалам, можа выявіць далёка не самы лепшы бок характару.



**КАЗЯРОГ.** Калі вы жадаеце дамагчыся прафесійных вынікаў, трэба дзейнічаць хоць і мякка, але вельмі настойліва. Не сядзіце, склаўшы рукі, нават калі вы абсалютна ўпэўнены ў тым, што ўсё неабходнае для поспеху ўжо зроблена. Ад вашай актыўнасці будзе залежаць увасабленне важных планаў у рэальнасць. У чацвер, займаючыся любімай справай, можаце здабыць згубленую гармонію. Будзьце больш уважлівыя да блізкіх людзей, і яны абавязкова адплацяць вам тым жа.



**ВАДАЛІЎ.** На гэтым тыдні сітуацыя на працы будзе складвацца ўдала. Атрымаеце шанц падняцца па кар'ернай лесвіцы. Справы будуць завяршацца лёгка, а любыя праблемы адступяць на задні план. У сераду неабходна сабрацца з сіламі і прыняць важнае рашэнне, якое паўплывае на далейшы лёс. У пятніцу вас можа наведаць цікавая ідэя, паспрабуйце яе зафіксаваць. Субота спрыяльная для зносін з сябрамі.



**РЫБЫ.** Давядзецца сабрацца і паразважаць пра абавязацельствы перад блізкімі людзьмі, вы занадта доўга раздавалі ім пустыя абяцанні. Веснавыя дзянькі больш схіляюць да весялосці, чым да працы, хоць, вядома, зусім адкруціцца ад апошняй не ўдасца. Самы напружаны час на працы — гэта сярэдзіна тыдня. Пакіньце дастаткова часу для адпачынку. Субота выдатна падыходзіць для рамантычнага спаткання.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.45 | 18.57 | 11.12 |
| Віцебск — | 7.36 | 18.46 | 11.10 |
| Магілёў — | 7.35 | 18.47 | 11.12 |
| Гомель — | 7.30 | 18.45 | 11.15 |
| Гродна — | 8.00 | 19.13 | 11.13 |
| Брэст — | 7.59 | 19.15 | 11.16 |

## Месяц

*Маладзік у 19.30*
*Месяц у сузор'і Рака.*

## Імяніны

***Пр.** Аляксандра, Астапа, Георгія, Данілы, Цімафея.*
***К.** Клаўдзіі, Ружы, Эльвіры, Віктара.*



Фота Алены ДАЎЖАНОК.

# ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 7 САКАВІКА




**1559** год — у Берасці заснавана пратэстанцкая друкарня, у якой была выдадзена Брэсцкая або Радзівілаўская біблія. Друкарня праісnavала ў горадзе да 1616 года, пазней была захоплена езуітамі і перавезена ў Вільню. У гэтай друкарні ўпершыню ў нашай краіне былі выдадзены друкаваным спосабам музычныя ноты.

**1588** год — на старабеларускай мове выдадзены «Апакрысіс» — палемічны твор Хрыстафора Філалета, накіраваны супраць Брэсцкай уніі і яе абаронцаў. З'явіўся ў адказ на кнігі апалагетаў уніі П. Скаргі і І. Пацея. З гэтага часу на працягу 50 гадоў вялася актыўная палеміка паміж праваслаўнымі і уніяцкімі тэолагамі.

**1919** год — нарадзіўся (г. Кіеў) Аляксей Аляксеевіч Слесарэнка, беларускі пісьменнік, акцёр эстрады, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. У 1938 годзе скончыў акцёрскую студыю ў Маскве. Працаваў на кінастудыі «Масфільм». З 1955 года — у Белдзяржфілармоніі, адначасова ў 1969—1974 гадах працаваў у Літаратурным музеі Я. Коласа. У рэпертуары былі творы беларускіх і рускіх пісьменнікаў, а таксама ўласныя літаратурныя кампазіцыі, у тым ліку «Народны паэт БССР Якуб Колас», «Успаміны пра Янку Купалу», «Паэзія Максіма Багдановіча», «Сатыра Кандрата Крапівы», «Проза Кузьмы Чорнага». Аўтар мемуараў пра дзеячаў літаратуры і мастацтва. Здымаўся ў мастацкіх фільмах «Палескія рабінзоны», «Бежын луг», «Аэраград», «Вясёлыя рабяты» і іншых. Памёр у 2005 годзе.

**1924** год — прынята пастанова ЦВК СССР «Аб аб'яднанні ў складзе Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ўсіх тэрыторый Савецкага Саюза з пераважнай большасцю беларускага насельніцтва» — пershае ўзбуйненне БССР.

**1954** год — першыя групы студэнтаў з Беларусі адпраўлены ў Казахстан на асваенне цалінных зямель.




**1764** год — расійская імператрыца Кацярына II падпісала Маніфест аб секулярызацыі манастырскіх зямель, згодна з якім царкоўныя землі былі перададзены ва ўласнасць дзяржавы.

**1876** год — амерыканскі вынаходнік Аляксандр Бэл атрымаў патэнт на вынайдзены ім тэлефонны апарат з металічнай мембранай.



**1894** — нарадзіўся Сяргей Лазо, герой Грамадзянскай вайны, савецкі военачальнік і дзяржаўны дзеяч, які браў актыўны ўдзел ва ўсталяванні савецкай улады ў Сібіры і на Далёкім Усходзе. Закатаваны інтэрвентамі ў 1920 годзе. Імем Лазо названы вуліцы ў гарадах Баранавічы, Барысаў, Брэст, Віцебск, Мінск, Магілёў і іншых. У гады Вялікай Айчыннай вайны яго імя было прысвоена партызанскай брыгадзе і 20 партызанскім атрадам, якія дзейнічалі на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

**1924** год — нарадзіўся Коба Абэ, японскі пісьменнік, доктар філалогіі. Аўтар аповесці «Сцяна», раманаў «Чацвёрты леднікові перыяд», «Чужы твар» і іншых. Памёр у 1993 годзе.

## УСМІХНЕМСЯ

Паслуга для мужчын «Анты8сакавіка».

Мы прыязджаем у форме з мігалкамі і арыштоўваем вас на вачах дзяўчыны/жонкі напярэдадні. І адпускаем праз суткі. У кошт уваходзіць месяца для рыбалкі/футбола/більярда, піва, закуска, настольныя гульні на выбар. Кошт — 200 рублёў.

**— Дарагі, не купляй мне пярсцёнак на 8 Сакавіка.**
**— Што з машынай?!**

Увага, мужыкі!

9 сакавіка з 10.00 будзе працаваць рэабілітацыйны цэнтр для мужчын, якія пацярпелі ад святкавання 8 Сакавіка. Цэнтр знаходзіцца па адрасе: гаражны кааператыў «Таварыш», блок № 7. Мы гарантуем выдатныя ўмовы знаходжання і поўны пакет паслуг: кансультацыя псіхолага з 30-гадовым стажам Пятровіча, камфортныя паддоны, мангал, тыднёвы запас мяса, піва, вэнджанай рыбы і сасісак, канструктар ГАЗ-21.

**А я сваёму сказала: «Запомні, дарагі! Як я 8 Сакавіка сустрэну, так ты год і правядзеш!»**

— Тата, а для чаго адзначаецца 8 Сакавіка?
— Што за дурное пытанне? Ты ж сын уладальніка кветкавага магазіна!




caricatura.ru

**У сувязі са святам наступны нумар «Звязды» выйдзе ў аўторак, 12 сакавіка.**


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 920.
Нумар падпісаны ў 19.30 6 сакавіка 2019 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

7 сакавіка 2019 г. № 10 (495)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ

## СТЫМУЛЫ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ ТЭРЫТОРЫЙ

Сёння, на жаль, далёка не ўсе рэгіянальныя бюджэты самадастатковыя. Якія механізмы для павышэння долі ўласных даходаў у агульным аб'ёме мясцовых бюджэтаў лепш выкарыстоўваць? Адказ на гэтае пытанне лепш за іншых ведае Мінфін. Яго кіраўнік Максім Ермаловіч расказаў народным абраннікам, якія прымалі ўдзел у сумесным пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі і Савета Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, на што неабходна звярнуць увагу. А яшчэ міністр анансаваў новыя падыходы Мінфіна па кіраванні ліквіднасцю сродкаў.

На ўсе пытанні — што рабіць і які інструментарый выкарыстоўваць па фарміраванні асноўных напрамкаў развіцця тэрыторый дзеля эфектыўнай рэгіянальнай палітыкі, накіраванай на павышэнне якасці жыцця насельніцтва, — дапамаглі знайсці адказ прадстаўнікі профільных міністэрстваў. Актывізацыя прадпрымальніцкай ініцыятывы, дапамога ў працаўладкаванні, якасць медыцынскіх паслуг, «смеццевыя войны»... Здаецца, кола абмеркаваных тэм не абмяжоўвалася толькі заяўленай у праграме. Асабліва шмат пытанняў узнікла па рэалізацыі нормаў дэкрэта аб садзейнічанні занятасці, паколькі большасць прысутных узначальвае адпаведныя камісіі ў сваіх рэгіёнах.

Падрабязней аб усім гэтым чытайце ў матэрыялах нашых карэспандэнтаў.

**ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на 4-й, 13–16-й стар.**


Фота БелТА.

**Унікальная вытворчасць сыроватачна-тлушчавага канцэнтрату на заводзе «Праймілк», што ў Шчучыне, адзіная такога ўзроўню ў краіне, безумоўна, становяча ўплывае на развіццё рэгіёна.**

ІНТЭРВ'Ю З НАГОДЫ



Мар'яна ШЧОТКІНА:

## «Жанчыны маюць рэальныя магчымасці ўплываць на працэсы ў краіне»

**Напярэдадні Міжнароднага жаночага дня наш карэспандэнт пагутарыў з намеснікам старшыні Савета Рэспублікі, старшынёй Беларускага саюза жанчын, нацыянальным каардынатарам па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Мар'янай ШЧОТКІНАЙ. Размаўлялі не толькі пра працоўныя моманты, але і пра яе пазіцыю па ЭКА, дабрачыннасць, гендарную роўнасць і, вядома ж, само 8 Сакавіка.**

***— Вы доўгія гады адыгрываеце значную ролю ў беларускай палітыцы. Якая пасада стала для вас найбольш складанай і чаму?***

— Ёсць такі выраз: не трэба быць важным, важна быць патрэбным. Галоўнае, каб чалавек ставіўся да сваёй працы адказна, бачыў перспектыву, забяспечваў развіццё сістэмы.

Якую пасаду я ні займала б — настаўніка, дырэктара, міністра, — заўсёды было няпроста. Кожная з іх для мяне была важнай і адказнай, і я лічыла, што менавіта на гэтай пасадзе буду працаваць усё жыццё. Мне заўсёды было цікава, я шмат чаму вучылася ў сваіх калег, а вакол былі прафесіяналы сваёй справы. Я пераймала іх вопыт, пастаянна імкнулася павышаць кваліфікацыю. Без гэтага немагчыма будаваць дзейнасць.

стар. 3

ПАРТНЁР ТЭМЫ ТЫДНЯ







## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Над чым працуем?



Якія законапраекты плануюць сёлета разгледзець у Савеце Рэспублікі. стар. 2

### Ратуйце ФАПы!



Міністэрства аховы здароўя дэпутатам: не дазваляйце закрываць гэтыя ўстановы, пакуль на вёсцы жывуць людзі. стар. 4

### Устойлівасць бюджэту



Залежыць ад развіцця малых і сярэдніх прадпрыемстваў. стар. 13

### «Залатая» сотка



Колькі гатовыя заплаціць ахвотныя за кавалак зямлі ў Смалявіцкім раёне? стар. 14

### Прынада для бізнесу



Як зацікавіць патэнцыйнага інвестара ўкласці грошы ў рэгіён. стар. 15

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Над чым неабходна працаваць?

**Пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь прайшло ў канцы мінулага тыдня пад кіраўніцтвам старшыні Савета Рэспублікі Міхаіла Мясніковіча.**

Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты беларускага парламента, на пасяджэнні разглядаліся пытанні законапраектнай дзейнасці ў 2019 годзе. З дакладамі выступілі старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Ала Бодак, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр Папкоў, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рахманаў.

Як праінфармавала Ала Бодак, план на бягучы год прадугледжвае падрыхтоўку 33 законапраектаў і 1 канцэпцыі законапраекта («Аб страхавой дзейнасці»). Пры гэтым плануецца распрацоўка 10 новых законаў: «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі», «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спыненні дзейнасці) суб'ектаў гаспадарання», «Аб самарэгуляваных арганізацыях», «Аб персанальных даных», «Аб ахове і выкарыстанні тарфянікаў», «Аб судова-экспертнай дзейнасці», а таксама чатыры законы «бюджэтнага пакета».

Па прапанове Савета Рэспублікі прадугледжваецца распрацоўка двух законапраектаў на аснове пакетнага прынцыпу, што дасць магчымасць забяспечыць комплекснасць і паўнату прававога рэгулявання грамадскіх адносін. Гэта законапраекты «Аб самарэгуляваных арганізацыях» і «Аб ахове і выкарыстанні тарфянікаў».

Старшыня Пастаяннай камісіі таксама праінфармавала аб падрыхтоўцы законапраектаў, якія павінны быць падрыхтаваны ў мэтах выканання Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады, Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва» і іншых рашэнняў кіраўніка дзяржавы.

Найбольш актуальнымі з'яўляюцца законапраекты, накіраваныя на развіццё прадпрымальніцтва, мясцовага самакіравання, паляпшэнне ўмоў функцыянавання гаспадарчых таварыстваў і ўдасканаленне механізмаў карпаратыўных адносін, інавацыйнай дзейнасці, абыходжання з адходамі, спрашчэнне патрабаванняў у сферы будаўніцтва, рашэнне пытанняў неплацежаздольных прадпрыемстваў, развіццё рынку плацежных паслуг, удасканаленне заканадаўства аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці.

Пастаяннымі камісіямі выпрацоўваюцца заўвагі і прапановы па законапраектах, якія рыхтуюцца, забяспечваецца ўдзел у пасяджэннях рабочых груп і профільных пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў, арганізуюцца круглыя сталы, семінары, пашыраныя пасяджэнні і іншыя мерапрыемствы.

Міхаіл Мясніковіч адзначыў неабходнасць актывізацыі працы над законапраектамі, падрыхтоўка якіх прадугледжана Дэкрэтам № 7. Ён таксама даручыць прааналізаваць, па якіх прычынах адбываецца парушэнне тэрмінаў унясення законапраектаў у Палату прадстаўнікоў.

# РАЗВІЦЦЁ БІЯТЭХНАЛОГІЙ — ПЕРСПЕКТЫЎНЫ НАПРАМАК



sovrep.gov.by

**У першы дзень вясны адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця першага пускавога комплексу Навукова-практычнага цэнтра біятэхналогій у Інстытуце мікрабіялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**

Удзел у ёй прыняў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл Мясніковіч, паведамляе прэс-служба верхняй палаты беларускага парламента.

Праектная магутнасць комплексу — 20 тон сухіх прабіятычных прэпаратаў на год. У будучыні тут плануецца запусціць другі пускавы комплекс, дзе штогод будуць выпускаць 56 тон вадкіх комплексных мікробных прэпаратаў для расліннаводства.

> Нам неабходна прырастаць такімі вытворчасцямі, якія забяспечваюць рост ВУП і павышэнне дабрабыту людзей. Развіццё біятэхналогій — адзін з перспектыўных напрамкаў.





Як растлумачыла дырэктар інстытута Эмілія Каламіец, вытворчасць такога аб'ёму прабіётыкаў у кормавытворчасці забяспечыць атрыманне звыш 40 тысяч тон высакаякасных збалансаваных айчынных кармоў для буйной рагатай жывёлы, птушкі, каштоўных відаў рыб. Эканамічны эфект ад выкарыстання інавацыйнай прадукцыі ацэньваецца ў суму каля 10 мільёнаў рублёў у год.

Новы цэнтр будзе садзейнічаць насычэнню ўнутранага рынку канкурэнтаздольнай экалагічна бяспечнай біятэхналагічнай прадукцыяй, пашырэнню яе асартыменту, павышэнню экспартнага патэнцыялу. Паводле экспертных ацэнак, сусветны рынак біятэхналогій да 2025 года дасягне 2 трыльёнаў долараў ЗША.

У сваю чаргу старшыня Савета Рэспублікі адзначыў, што новы цэнтр — гэта не толькі доследная, але і прамысловая вытворчасць, дзе будуць выпускаць інавацыйную прадукцыю, запатрабаваную на ўнутраным рынку.

— Нам неабходна прырастаць такімі вытворчасцямі, якія забяспечваюць рост ВУП і павышэнне дабрабыту людзей. Развіццё біятэхналогій — адзін з перспектыўных напрамкаў, — падкрэсліў ён.

Сёння Нацыянальная акадэмія навук робіць стаўку на развіццё такіх сучасных цэнтраў.

— НАН фактычна з'яўляецца буйной навукова-вытворчай карпарацыяй, якая забяспечвае поўны тэхналагічны цыкл — ад фундаментальных прыкладных даследаванняў да вытворчасці інавацыйнай прадукцыі і яе рэалізацыі, — дадаў Міхаіл Мясніковіч.

Дарэчы, тут працуюць 15,5 тысячы чалавек, з іх 5,6 тысячы — даследчыкі, астатнія задзейнічаны ў навукова-вытворчым цыкле.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# КАНТАКТЫ ДЛЯ КАНТРАКТАЎ

**У свой час, у 2016 годзе, парламенцкая дэлегацыя, якую ўзначальваў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч, наведала з афіцыйным візітам Індыю. У складзе дэлегацыі з мэтай усталявання супрацоўніцтва прымалі ўдзел і прадстаўнікі БДУІРа. Які плён прынеслі гэтыя кантакты, паведамілі ў прэс-службе Савета Рэспублікі.**

Па выніках візіту ўпершыню былі падпісаны мемарандум аб узаемаразуменні і два пагадненні паміж БДУІРам і Інстытутам інфармацыйных тэхналогій Дэлі і праграма супрацоўніцтва паміж гэтай беларускай ВНУ і Нацыянальным інстытутам тэхналогій імя Вісвесварая.

У 2016 годзе БДУІР таксама прыняў удзел у пасяджэнні сумеснай рабочай групы па рэалізацыі пагаднення паміж Міністэрствам адукацыі Беларусі і Міністэрствам развіцця людскіх рэсурсаў Індыі аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі.

У выніку праведзенай працы за апошнія чатыры гады ўніверсітэтам заключана і выканана сем кантрактаў у галіне радыёлакацыі агульным аб'ёмам фінансавання 2,2 мільёна долараў ЗША, з іх у мінулым годзе — аб'ёмам 1,1 мільёна долараў.

Сёлета па заказе кампаніі Essipl выконваецца кантракт агульным аб'ёмам 380 тысяч долараў. Летась БДУІР выйграў тэндар на стварэнне новага тыпу тэлекамунікацыйнай сістэмы для індыйскіх заказчыкаў. У цяперашні час ідзе ўзгадненне ўмоў гэтага кантракта агульным аб'ёмам фінансавання 3,5 мільёна долараў.

Акрамя таго, у 2017—2018 гадах сфарміравана Праграма супрацоўніцтва паміж БДУІРам і Нацыянальным інстытутам тэхналогій імя Вісвесварая на 2018/2019 навучальны год. Выкананы грант «Золь-гель пакрыццё для пераўтварэння энергіі і выкарыстання ў фатоніцы і мікраэлектроніцы», устаноўлены кантакты з Нацыянальным інстытутам тэхналогіі, Індыйскім інстытутам тэхналогій (г. Гувахаці), Індыйскім інстытутам тэхналогій (г. Дэлі), Глабальным універсітэтам Джындал.

# «Жанчыны маюць рэальныя магчымасці ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

У любой працы трэба ўмець слухаць і чуць. Правільна кіраўнік дзяржавы звяртае ўвагу на работу дзяржаўных органаў — трэба сустракацца з людзьмі, працоўнымі калектывамі, праводзіць асабістыя прыёмы. Практыка паказвае, што гэтыя сустрэчы даюць шмат важнай інфармацыі, якую можна і трэба выкарыстоўваць у сваёй дзейнасці.

Кожную працу трэба рабіць добра і падыходзіць да яе з таго пункту гледжання, што, калі ты займаеш пэўную пасаду, значыць, павінен даць вынік. А вынік будзе толькі ў тым выпадку, калі табе цікавая твая справа.

***— Мар'яна Акіндзінаўна, вы — старшыня Беларускага саюза жанчын. Па якіх новых кірунках ваша грамадскае аб'яднанне пачало працу ў апошнія гады і якія з іх вы лічыце найбольш важным?***

— БСЖ з'яўляецца самай масавай жаночай арганізацыяй у нашай краіне. За гады свайго існавання — а сёлета саюзу спаўняецца 28 гадоў — склалася сістэма традыцыйных мерапрыемстваў і акцый, якія накіраваны на аказанне дапамогі і падтрымкі жанчынам, сем'ям, дзецям, на забеспячэнне годнага становішча жанчын у грамадстве. Гэта нашы стратэгічныя напрамкі дзейнасці.

Сёння ў рабоце БСЖ асноўны вектар накіраваны на павышэнне ролі жанчын у грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным жыцці краіны. Сучасныя жанчыны павінны канкурыраваць на рынку працы на роўных з мужчынамі, таму БСЖ актыўна працуе над тым, каб у жанчын былі ўсе магчымасці ў прафесійнай падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы, павышэнні кваліфікацыі.

У 2018 годзе сумесна з асацыяцыяй абароны інтэлектуальнай уласнасці «БелБрэнд» мы запусцілі новы праект — «Жаночая справа», накіраваны на раскрыццё жаночага патэнцыялу ў развіцці прадпрымальніцтва і самазанятасці.

Удзельнікамі праекта стала больш за 20 жанчын-прадпрымальнікаў. Сферы іх дзейнасці розныя: вытворчасць, медыцына, адукацыя, аграэкатурызм, рамесніцтва, сацыяльнае прадпрымальніцтва, культура. Для ўдзельніц арганізаваны навучальныя семінары, майстар-класы, выстаўкі, відэапрэзентацыі і іншыя мерапрыемствы, накіраваныя на ажыццяўленне адраснай дапамогі жанчынам-прадпрымальніцам, аказанне неабходнай падтрымкі ў вядзенні іх бізнэсу.

Вядзецца актыўная праца з моладдзю. Пры БСЖ працуе маладзёжны клуб, які ахоплівае асноўныя зоны інтарэсаў маладых жанчын — асобасны рост і самарэалізацыю, пабудову адносін у сям'і, здаровы лад жыцця і іншыя. На гэта накіравана рэалізацыя праектаў, сярод якіх рэспубліканскі праект па фарміраванні сямейных каштоўнасцяў і ўсвядомленага бацькоўства ў дзяцей і моладзі «Сафія», цыкл навучальных лекцый, дыскусій, круглых сталоў, якія датычацца сям'і і шлюбу, міжасобасных адносін. У сакавіку стартуе медыка-сацыяльны праект «Вясновае ператварэнне».

Натуральна, для таго каб быў унутраны драйв, павінны адбывацца працэсы, якія спрыяюць развіццю самой арганізацыі.



З гэтай мэтай са студзеня 2019 года стартаваў агляд-конкурс грамадзянска-патрыятычных праектаў раённых і першасных арганізацый БСЖ «Найлепшы праект — 2019». Асноўная мэта конкурсу — актывізацыя дзейнасці пярвічных арганізацый і развіццё грамадзянскай ініцыятывы, абмен вопытам і перадавымі практыкамі ў працы.

Пераможцы конкурсу будуць вызначаны ў канцы 2019 года ў намінацыях: «Духоўнасць. Культура. Здаровы лад жыцця», «Трэці ўзрост», «За чысты Дом, чыстую Краіну, чыстую Планету», «Хваля памяці», «Сімвалы малой Радзімы», «За мір, міжнароднае супрацоўніцтва і сяброўства».

Напярэдадні 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у рамках рэспубліканскай акцыі «Беларусь помніць» БСЖ ініцыюе правядзенне маштабнай акцыі «Беларусь помніць. Жаночы твар Перамогі», у цэнтры ўвагі якой — жанчыны, іх гераічны і працоўны подзвіг у гады Вялікай Айчыннай вайны і ў перыяд аднаўлення краіны з руін.

Па ўсёй краіне пройдзе шэраг мерапрыемстваў па дадзенай тэматыцы, а сумесна з музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і на яго базе 26 сакавіка мы правядзём тэматычны круглы стол, будзе арганізавана работа фотавыстаўкі пра жанчын-франтавікоў, жанчын-партызанаў, працаўніц тылу, чые імёны ўпісаны ў гісторыю Вялікай Перамогі.

## МОЦ — У ДАПАМОЗЕ

***— Нядаўна на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы абмяркоўвалі тэму дэмаграфіі і спадарожныя праблемы. А як вы ставіцеся да першага ЭКА за кошт дзяржавы?***

— Давайце проста па-чалавечы скажам: ствараецца сям'я, натуральна, што кожная сям'я марыць пра дзяцей. Наша шчасце ў дзецях, і, калі дзяржава можа падтрымаць чымсьці, яна павінна дапамагаць, што яна і робіць.

Прэзідэнт правільна сказаў, што сістэма дапамог, падтрымкі сем'яў у нас вельмі вялікая. Разам з тым ён дакладна заўважыў, што часы мяняюцца. Можа быць, трэба нешта карэктаваць, нешта ўводзіць новае.

Гэтыя пытанні мы абмяркоўвалі і ў Беларускім саюзе жанчын. На наш погляд, трэба больш увагі аддаць маладым сем'ям з дзецьмі, у тым ліку і студэнцкім, падтрымліваць іх, дапамагаць праз жыллё, сістэму стыпендый і мер дадатковай падтрымкі.

Вельмі важнае сумяшчэнне сямейных і прафесійных абавязкаў, прычым не толькі для жанчын. Трэба разглядаць варыянты гнуткага працоўнага дня, магчымасць дыстанцыйнай працы, розныя рашэнні для супрацоўнікаў унутры арганізацый. Падтрымка сям'і была, ёсць і будзе прыярытэтам дзяржавы. Мы павінны рабіць усё, каб насельніцтва нашай краіны павялічвалася.

***— Адна з мэт і задач Беларускага саюза жанчын — ажыццяўленне дабрачыннай дзейнасці. Як і каму дапамагае ваша арганізацыя?***

— Да дабрачыннай працы нашы рэгіянальныя арганізацыі прыцягваюць валанцёраў, а таксама людзей, якія хочуць аказаць дапамогу, — і ў гэтым вялікі патэнцыял у бізнесу.

І прыкладаў гэтага шмат. Так, Беларускі саюз жанчын пры падтрымцы бізнес-колаў у рамках руху «З любоўю да Беларусі» перадаў абласным дамам-інтэрнатам шэсць новых аўтамабіляў «Газель», спецыяльна абсталяваных для перавозкі інвалідаў-калясачнікаў. Сталічная бальніца хуткай дапамогі атрымала рабатызаваны трэнажор, прызначаны для аднаўлення рухальных і каардынаторных парушэнняў. Гэта досыць дарагі рэабілітацыйны комплекс, які мы падарылі пры дапамозе прадстаўнікоў бізнесу.

Традыцыйна пры падтрымцы спонсараў мы ўдзельнічаем у акцыі «Нашы дзеці». У гэтым годзе на яе правядзенне прыцягнута больш за 600 тысяч рублёў. Мы ахапілі розныя навучальныя ўстановы, у тым ліку ў аддаленых населеных пунктах, сем'і, сацыяльныя прытулкі.

Упершыню ў рамках акцыі ў Мінску пры падтрымцы апякунскага савета БСЖ мы правялі навагоднюю дабрачынную ёлку для больш чым 450 дзяцей з малазабяспечаных і шматдзетных сем'яў, дзяцей-інвалідаў, дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Рабяты змаглі не толькі прыняць удзел у навагоднім прадстаўленні, паглядзець спектакль, але і атрымаць салодкія падарункі ад БСЖ.

Актыўна працуюць па аказанні дапамогі і падтрымкі нашы раённыя і пярвічныя арганізацыі, прычым не толькі ў межах правядзення акцый і мерапрыемстваў. Практычна ў кожнай нашай арганізацыі ёсць так званыя падшэфныя — гэта ўстановы адукацыі, аховы здароўя або сацыяльнай абароны альбо канкрэтныя сем'і, людзі, якім патрэбны дапамога і падтрымка.

Мы будзем працягваць гэтую працу і запрашаем да супрацоўніцтва ўсіх, хто жадае рабіць свет дабрэйшым.

## ПРА АСАБІСТАЕ

***— Кожны год ваша арганізацыя праводзіць конкурс «Жанчына года». Хто стаў ёй для вас сёлета?***

— У гэтым годзе пройдзе ўжо адзінаццаты рэспубліканскі конкурс «Жанчына года», які дазваляе жанчынам заявіць пра сябе, прадэманстраваць свой унёсак ва ўмацаванне сям'і, выхаванне дзяцей, сацыяльна-эканамічнае і гуманітарна-культурнае развіццё краіны ў намінацыях «Духоўнасць і культура», «Гаспадыня вёскі», «Матчына слава», «Актыўная жыццёвая пазіцыя», «Лідарства і паспяховае кіраўніцтва».

Цяпер ва ўсіх абласцях праходзяць фіналы конкурсу, а ўрачыстая цырымонія ўшанавання пераможцаў адбудзецца ў Мінску 16 сакавіка.

Асабіста для мяне жанчына 2018 года — гэта мая свякроў, якая, на жаль, нядаўна пайшла з жыцця. Яна ўсё сваё жыццё паказвала прыклад жанчыны, якая нароўні з прафесійнай дзейнасцю захоўвала баланс інтарэсаў усіх сем'яў — і сваёй, і дзяцей. Гэта мудры, вельмі разумны і творчы чалавек. У прынцыпе дзякуючы ёй і муж, і дзеці, і нявесткі шмат чаго дамагліся.

Нашы бацькі адыгрываюць у нашым жыцці лідзіруючую ролю, але часцяком мы разумеем гэта толькі потым. Яна заключаецца ў тым, каб стварыць такую сітуацыю поспеху, пры якой было б развіццё кожнага дзіцяці ў сям'і. Навучыць самастойнасці, уменню браць на сябе адказнасць і прымаць рашэнні, пры гэтым шанаваць сям'ю, паважаць яе членаў, даваць кожнаму прастору і свабоду, умець слухаць і чуць.

## А ШТО, КАЛІ...

***— Вы — нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця. Растлумачце простымі словамі, што дасць Беларусі поўнае дасягненне МУР?***

— Дасягненне 17 Мэт устойлівага развіцця самым непасрэдным чынам звязана з ростам дабрабыту грамадзян, стварэннем паўнавартасных магчымасцяў для гарманічнага развіцця асобы, грамадства і ўсіх яго інстытутаў пры дапамозе развіцця трох асноўных кампанентаў — эканамічнага, экалагічнага, сацыяльнага.

Гэта глабальныя мэты, якія звязваюць усе дзяржавы, і асобная краіна не можа ўзяць і выканаць усе МУР, таму што межы паміж краінамі вельмі ўмоўныя. Мы не можам падзяліць лясы, акіяны, атмасферу, гэта — наша, а гэта — не.

Мы ўсе настолькі ўзаемазвязаныя, што павінны жыць разам, думаць адно пра аднаго і працаваць па многіх напрамках разам.

17 Мэт устойлівага развіцця таксама шчыльна звязаныя. З іх нельга вылучыць галоўныя і другарадныя. Узяць, напрыклад, здароўе: кожны хоча быць здаровым. Чым старэйшым становіцца чалавек, тым больш ён звяртае ўвагу на тое, што каштоўнейшага за здароўе няма нічога. Пры гэтым мы ўсе разумеем, што здароўя не можа быць без нармальнай экалогіі, чыстай вады і паветра, якасных прадуктаў харчавання, такім чынам, неабходна развіццё сельскай гаспадаркі, прамысловасці і гэтак далей.

Думаю, ланцужок зразумелы: усё ўзаемазвязана і накіравана на ўсе сферы жыццядзейнасці чалавека.

Таму мы і кажам, што Мэты ўстойлівага развіцця датычацца кожнага з нас і іх дасягненне — гэта наша з вамі задача. Мы працуем самі для сябе, для свайго дабрабыту. І ад нашага ўзаемадзеяння, зладжанасці работы залежыць вынік.

***— Яшчэ адна актуальная тэма — забеспячэнне гендарнай роўнасці. Вы казалі, што гэтае пытанне вызначана ў Беларусі ў якасці аднаго з акселератараў для дасягнення МУР. Што робіцца для яго вырашэння?***

— Пытанні забеспячэння гендарнай роўнасці вызначаны ў нашай краіне ў якасці аднаго з «паскаральнікаў» для дасягнення Мэт устойлівага развіцця.

Ролю каардынатара ў гэтай працы ажыццяўляе Нацыянальны савет па гендарнай палітыцы пры Савеце Міністраў, які ўзначальвае міністр працы і сацыяльнай абароны.

У Беларусі рэалізуецца ўжо пяты Нацыянальны план дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці, накіраваны на садзейнічанне выкананню нашай краінай міжнародных абавязацельстваў у галіне забеспячэння роўных правоў і магчымасцяў мужчын і жанчын.

У Беларусі жанчыны складаюць больш за 53 % насельніцтва краіны, іх колькасць сярод занятых у эканоміцы — 55,2 %, з іх 38 % маюць вышэйшую адукацыю.

Сярод дзяржаўных служачых жанчыны складаюць 67,4 %. Сярод кіраўнікоў — 48 % жанчыны. У парламенце больш за 33 % жанчын, а ў мясцовых Саветах дэпутатаў іх больш за 48 %.

Так што жанчыны маюць рэальныя магчымасці ўплываць на працэсы ў краіне, а ўдзел жанчыны ў кіраванні — гэта фактар, які стабілізуе, таму што яны ўзважаныя, арыентаваныя на вынік, зацікаўленыя ў стабільнасці і больш сацыяльна адказныя.

Улічваючы ўзровень адукаванасці сучасных жанчын, іх запатрабаванні і амбіцыі, наша асноўная задача: стварыць умовы для іх поўнай самарэалізацыі — гэта аснова дзяржаўнай палітыкі і Мэты № 5. Галоўнае — даць роўныя магчымасці, а рашэнне прыме сама жанчына. Яна сама павінна вырашаць, што для яе важнейшае — сям'я, кар'ера або іх сумяшчэнне.

Сёння на заканадаўчым узроўні многае для гэтага зроблена, але неабходна далейшая эвалюцыя нормаў і каштоўнасцяў, якія спрыяюць раскрыццю і рэалізацыі патэнцыялу жанчын, ліквідацыі стэрэатыпаў, пашырэнню магчымасцяў для сумяшчэння розных роляў.

## ПРА 8 САКАВІКА

***— Што для вас Міжнародны жаночы дзень?***

— Міжнародны жаночы дзень ужо не мае такой палітычнай афарбоўкі, як раней. Сёння гэта дзень ушанавання жанчын — прыцягнення ўвагі да іх ролі ў сям'і і грамадстве.

Напярэдадні 8 Сакавіка актывізуецца абмеркаванне пытанняў роўнасці жанчын, праходзяць сустрэчы, семінары, канферэнцыі, на якіх праводзіцца пэўны зрэз становішча жанчын у грамадстве. У Беларусі вялікая ўвагі аддаецца гэтым пытанням, многае зроблена, але не варта спыняцца на дасягнутым, трэба ўвесь час рухацца наперад.

***— Што б вы пажадалі беларускім жанчынам у гэтае свята?***

— Шчасця, гармоніі, сямейнага цяпла і поспехаў.

**Гутарыў Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# УСТОЙЧИВЕЕ РАЗВИТИЕ — КАЧЕСТВЕННЕЕ ЖИЗНЬ

Открывая пленарное заседание, **председатель Постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению Александр ПОПКОВ** напомнил о положениях протокола поручений Президента от 2 марта 2018 года и Программы социально-экономического развития Беларуси на 2016—2020 годы. Эти документы должны стать настольной книгой для каждого руководителя.

В частности, прирост ВВП следует обеспечивать за счет работы новых предприятий и производств, увеличения доли малого и среднего бизнеса, трудоустройства на вновь созданные рабочие места. «Как видите, мы ничего не изобретаем, а всего лишь координируем действия на всех уровнях», — подчеркнул Александр Андреевич и привел в качестве примеров Дзержинский, Минский и Смолевичский районы.

Их участники совместного заседания посетили накануне и убедились: регионы самодостаточны, не требуют финансирования (более подробно на стр. 4, 13—16). На такие результаты нацелили и председателей Советов всей страны.

## Главный принцип в работе — не заявительный, а выявительный

**Декрет «О содействии занятости населения» — основной документ в работе.**

— В зоне пристального внимания председателей Советов депутатов должны быть все не занятые в экономике граждане, — уверен **первый заместитель министра труда и социальной защиты Андрей ЛОБОВИЧ.**

Он напомнил, что местные бюджеты могут участвовать в финансировании мероприятий по обеспечению занятости населения на территориях с напряженной ситуацией на рынке труда. В прошлом году в стране было определено 48 таких территорий. К решению проблем подошли комплексно, за год показатели этих районов улучшились. На текущий год определено 53 региона — рост из-за того, что изменилась методика отнесения территорий к напряженным.

На этот год показатели установлены не менее строгие. Но их удастся выполнить, убежден Андрей Лобович. Ключевое требование к местной власти — трудоустройство граждан на вновь созданные рабочие места (более 73,5 тысячи человек в 2018 году устроены именно так при задании 70 тысяч). Кроме того, первый замминистра акцентировал внимание председателей местных Советов на вопросах трудоустройства безработных, имеющих дополнительные гарантии занятости (те, кто не может на равных конкурировать на рынке труда).

Около 20 % человек из базы данных не занятых в экономике не работают больше 16 лет. Понятно, что у этих людей либо теневой бизнес, либо заработки в другой стране. Комиссиям по содействию занятости стоит не ждать, пока к ним обратятся граждане, а самим выявлять тех, кому нужна помощь, и помогать им.

— С принятием декрета в стране внедрен комплексный подход по содействию гражданам в трудоустройстве и мониторингу ситуации на рынке труда. У каждого из нас должен быть четкий план действий по реализации задач в области занятости населения. Комплексно подойти, найти, достучаться до каждого... Результат — рост численности занятых в экономике, — заключил Андрей Лобович.

## Благополучие человека на 80 % состоит из воды

**Устойчивое развитие территорий невозможно без стабильной работы жилищно-коммунального хозяйства.**

Качество жизни начинается с чистой воды, теплого жилья и уютных дворов. Как правило, вопросы ЖКХ больше всего волнуют избирателей.

Как сообщил народным избранникам **первый заместитель министра жилищно-коммунального хозяйства Геннадий ТРУБИЛО,** в прошлом году проведен капитальный ремонт 2,2 миллиона «квадратов» жилья. Ветхого и аварийного в стране практически не осталось. В 2018-м заменено 2678 лифтов — это больше, чем за последние пять лет. Кстати, для интенсивной замены лифтов созданы не только дополнительные мощности, но и новые рабочие места.



Александр ПОПКОВ: «Вопросы жилищно-коммунального хозяйства — это вопросы, контроля которых требует сама жизнь. И в первую очередь это вопросы местных Советов депутатов, которые должны видеть дополнительные источники финансирования, привлекать спонсоров, вместе искать решения. Необходимую помощь со своей стороны мы всегда готовы оказать».

По вторичному использованию твердых коммунальных отходов наша страна опережает СНГ — 20 %. И рост эффективности обращения с ТКО растет.

Самой главной задачей Геннадий Алексеевич считает обеспечение населения качественной питьевой водой. Улучшению качества воды в стране рек и озер уделяется постоянное и повышенное внимание. Только в 2018 году в эксплуатацию введена сорок одна станция обезжелезивания и завершается строительство двадцати пяти (за предыдущие два года их было девятнадцать). На этот год запланирована замена не менее 258 станций.

Доступ к качественной питьевой воде обеспечивается за счет подключения к существующим коммуникациям, а также бурения новых скважин. В общем, государственная программа на 2016—2020 годы «Комфортное жилье и благоприятная среда» стала непосредственным руководством к действию.

## Когда рубль приносит сотню

**Здоровьесберегающие программы и низкий эффект от закрытия ФАПов.**

— Один рубль, вложенный в антитабачную программу, за год приносит сорок. А рубль, затраченный на снижение содержания соли в продуктах питания, через 15 лет обернется сотней, — сообщил депутатам первый **заместитель министра здравоохранения Дмитрий ПИНЕВИЧ.**



А показатель качества жизни косвенно влияет даже на производство валового регионального продукта.

Обращаясь к председателям местных Советов, Дмитрий Леонидович рекомендовал в своих регионах особое внимание уделить профилактике детского травматизма и смертности от внешних причин.

Избирателям в регионах нужны ФАПы и больницы сестринского ухода — не стоит их закрывать, все равно экономия выйдет копеечной. И уж тем более Дмитрий Пиневич также обратил внимание на необходимость создания «центров притяжения», как это сделали в Орше, для дальнейшей оптимизации больничной сети.

Кроме того, почти 30 % врачей — молодых специалистов не обеспечены жильем. Останутся ли они после отработки в районе, вопрос риторический.

Беларусь, в отличие от других стран, не собирается отказываться от системы скорой медицинской помощи. Более того, у нас улучшены соответствующие социальные стандарты. Первый замминистра порекомендовал депутатам изучить, на чем ездят медики на вызовы, как происходит распределение персонала.

## Борьба с короедом и ягоды для всех

**В Беларуси продолжается облесение и восстановление лесов, наведение порядка и благоустройство «легких Европы», модернизация деревообрабатывающих производств.**

